Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 41 (3945)
ЧАЦЬВЕР, 12 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА

Заваяваць тэхніку

«Існаваньне капіталістычнага грамадзтва ня можа працягвацца далей. Яно вычарпала сябе і адзнакі разлажэньня прыкметны ва ўсіх галінах...» («Нью-Ёрк, Таймс»).

Гіганцкі эканамічны крызіс, які сатрасае капіталістычны сьвет, прыводзіць да таго, што ў краіне містэра Фіша на старонках нават гэтай буржуазнай газэты — кроўнага ворага сацыялізму, падпісваецца прыгавор капіталізму.

За рубяжом СССР прамысловая дэпрэсія ўзяла за горла ўсе без выключэньня краіны капіталу. За рубяжом СССР банкрутства банкаў, скарачэньне вытворчасьці і бязупынны рост беспрацоўя сталі такой-жа звычайнай зьявай, як чарговы бюлетэнь аб надвор'і. У нас—пераможнае ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады, мы ўступілі ў пэрыяд сацыялізму. Такава абстаноўка, у сьвятле якой драмова тав. СТАЛІНА на ўсесаюзнай канфэрэнцыі працаўнікоў прамысловасьці набывае найвялікшае гістарычнае значэньне.

Краіна дыктатуры пралетарыяту, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, з посьпехам будуе сацыялізм і ідзе цьвёрда і ўпэўнена да новых бояў, да новых перамог. Нават нашы ворагі, сьцяўшы зубы ў сьмяротным жаху перад перамогай пяцігодкі, ня могуць не прызнаваць нашых дасягненьняў.

Разграміўшы трацкізм і правы апартунізм, зруйнаваўшы мізэрныя падкопы меншэвіцкага права - «правацкага» блёку, партыя пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК дабілася рашаючых перамог на ўсіх франтох сацыялістычнага наступленьня.

Расьце і мацнее сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі. Серадняк усёй сваёй масай пайшоў у калгас. Да канца пяцігодкі калектывізацыя СССР у асноўным будзе завершана. На аснове суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца як кляса апошні аплот капіталістычнай эксплёатацыі ў вёсцы — кулацтва. У Савецкім Саюзе няма беспрацоўя. Гэта ў той час, як за рубяжом 20-мільённую армію беспрацоўных кожны дзень папаўняюць усё новыя і новыя тысячы пралетараў.

1930 год даў па Саюзе прырост прамысловай прадукцыі 25 проц. Савецкая Беларусь — фарпост СССР—у другім годзе пяцігодкі дабілася яшчэ больш высокіх тэмпаў росту, — 67,5 проц. Якая капіталістычная дзяржава дасягнула такога прыросту прадукцыі? Такой дзяржавы няма. Жабрацкая капёнка пры царызьме, Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка пры дыктатуры пралетарыяту — БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, разгортвае індустрыялізацыю такімі тэмпамі, якіх ніколі ня ведала і ня ведае ні адна краіна капіталу. Ня бачыць гэтага, як прабуюць рабіць махровыя праўыя апартуністы, поўныя здраднікі рабочай клясы, гэта значыць ня верыць фактам, гэта значыць адмаўляць сапраўднасьць.

Аднак, мы зрабілі-б глыбокую памылку, калі-б супакоіліся на дасягнутых посьпехах. Было-б шкодным чванствам, супроць якога так жорстка выступаў Уладзімер Ільліч, сказаць, што мы ўжо ў поўнай меры ўмеем выкарыстаць усе магчымасьці, усе перавагі савецкага ладу для паскарэньня тэмпаў будаўніцтва сацыялізму. Займацца бахвальствам не ўпесьцілі бальшавікам. Не, ня ўсе тыя магчымасьці і перавагі, якія дае нам дыктатура пралетарыяту і жалезнае адзінства радоў яго авангарду — бальшавіцкай партыі: не, ня ўсе тыя магчымасьці і перавагі, якія дае нам пераважнасьць нашай прамысловасьці — «самай канцэнтраванай прамысловасьці ў сьвеце» (І. Сталін): не, ня ўсе тыя магчымасьці, якія дае нам незвычайны рост энтузіязму і ўздыму мас, — мы выкарыстоўваем выстарчальна, мы ня ўмеем яшчэ выкарыстоўваць іх у поўнай меры.

25 проц. росту па Саюзе і 67 з пал. процантаў па БССР—гіганцкая перамога, аб якой ня можа нават марыць самая перадавая капіталістычная дзяржава. Але-ж праграма другога году пяцігодкі выканана няпоўнасьцю. Прамысловасьць БССР у 1930 годзе, выканаўшы праграму другога году пяцігодкі на 95,3 проц., недадала краіне працукцыі на 13 мільёнаў руб., і таму перамога, якая немагчыма для капіталістычных дзяржаў, дп янас зьяўляецца невыстарчальнай.

У краіне дыктатуры пралетарыяту магчымы яшчэ большыя перамогі, яшчэ больш высокія тэмпы росту, бо ў нашым распараджэньні для гэтага ёсьць усе аб'ектыўныя магчымасьці. Гэтыя магчымасьці заключаюцца ў тых перавагах, якія дае нам пралетарская дыктатура, у канцэнтрацыі нашай прамысловасьці і буйной с.-г. вытворчасьці, у невычарпальных прыродных багацьцях нашай краіны. І калі мы, дасягнуўшы найвялікшых перамог у справе будаўніцтва сацыялізму, калі мы, паказаўшы небачаныя ў гісторыі тэмпы разьвіцьця, усё-ж непоўнасьцю выканалі плян, то гэта значыць, што мы яшчэ не навучыліся ў максымальнай меры выкарыстоўваць нашы магчымасьці.

У нас «не хапіла ўменьня выкарыстаць наўпоўнага магчымасьці, не хапіла ўменьня правільна кіраваць заводамі». (І. Сталін).

Ня выконваць плянаў, гэта значыць адстаць, затармазіць тэмпы нашага руху па шляху да сацыялізму.

«Нельга зьніжаць тэмпы. Наадварот, па меры сіл і магчымасьцяй, нам трэба іх павялічваць. Гэтага патрабуюць ад нас нашы абавязацельствы перад рабочымі і сялянамі СССР. Гэтага патрабуюць ад нас нашы абавязацельствы перад рабочай клясай усяго сьвету. Затрымаць тэмпы, гэта значыць адстаць».

Каб перамагчы ў нашай барацьбе за сацыялізм супроць сусьветнага капіталізму, каб апраўдаць надзеі сусьветнага пралетарыяту, мы павінны той шлях, які капіталістычныя краіны прайшлі за 100 год, прабегчы максымум за 10 год.

Выкарыстаць усе магчымасьці, якія дае нам пралетарская дыктатура, пабальшавіцку кіраваць вытворчасьцю, заваяваць тэхніку для ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры, а па радзе важнейшых галін і за тры гады, — такі гістарычны сэнс і значэньне прамовы тав. Сталіна.

Каб заваяваць тэхніку, каб аўпадаць вышынямі кіраўніцтва заводамі і фабрыкамі, патрэбны кадры спэцыялістаў з рабочай клясы, патрэбен новы тып камуніста-гаспадарніка.

І таму тав. Сталін у сваёй прамове ставіць перад партыяй бясьпрэцэдэнтны лозунг—БАЛЬШАВІКІ ПАВІННЫ САМІ СТАЦЬ СПЭЦЫЯЛІСТАМІ. Спэцыялістамі, якія змогуць па-бальшавіцку кіраваць вытворчасьцю, якія заваююць тэхніку.

«Калі ты дырэктар заводу, умешвайся ва ўсе справы, сачы за ўсім, не абмінай нічога, вучыся і яшчэ раз вучыся. Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай. Ужо час бальшавікам самім стаць спэцыялістамі. Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё. І гаспадарнік, які ня хоча вывучаць тэхніку, які ня хоча аўладаць тэхнікай—гэта анэкдот, а не гаспадарнік». (І. Сталін).

Іменна на гэтай задачы павінна быць сканцэнтравана ўся наша увага, сюды павінны быць накіраваны ўся наша воля, энэргія, сілы. Не сакрэт, што і сярод нашых гаспадарнікаў ёсьць людзі, якія, не імкнучыся і не жадаючы вывучаць тэхнічных працэсаў, ажыцьцяўляюць сваё кіраўніцтва прадпрыемствам падпісваньнем папер. Шкодніцтва як форма праяўленьня клясавай барацьбы, як форма супраціўленьня клясавых ворагаў наступленьню сацыялізму, мела магчымасьць пашырацца ў пэўнай ступені іменна дзякуючы такой тэхнічнай адстапасьці нашых гаспадарнікаў.

Матар'ялы аб шкодніцтве ў ДЗЯРЖПЛЯНЕ, ЛЕСБЕЛЕ і г. д. ярка паказваюць тыя камуністаў-апартуністаў, якія, ня ўнікаюць у сутнасьць справы, давяраючы ўсё тэхнічнае кіраўніцтва, усе асноўныя працэсы работы буржуазным спэцыялістам, страціві клясавую чуйнасьць і не заўважылі, як у іх-жа ўстановах шкоднікі праводзілі сваю контрэвалюцыйную работу.

Беларуская агентура Кандрацьцевых і Громанаў, якая прабралася ў апарат Дзяржпляну, складала сваю «пяцігодку» шкодніцтва. Шкоднікі нараджалі пляны, накіраваныя супроць індустрыялізацыі, супроць калгасаў, практыкуючы прышчэпаўскую хутарызацыю і «бязупынны рост беспрацоўя ў БССР».

І гэтым контр-рэвалюцыянэрам правыя апартуністы з кіраўніцтва Дзяржпляну даверылі ўсю асноўную работу, гэтых майстроў ад шкодніцтва яны лічылі «незаменнымі спэцамі».

Пляны шкодніцкаў разьбіліся аб непарушную магутнасьць дыктатуры пралетарыяту, аб усё ўзрастаючы энтузіязм рабочай клясы і мільённых калгасных і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас. Мы намагаем усе сілы, каб хутчэй вырашыць праблему пралетарскіх кадраў—неабходную ўмову ліквідацыі рэштак шкодніцтва.

Мы будзем з бальшавіцкай энэргіяй змагацца за тое, каб «стаць самім поўнымі гаспадарамі справы». (І. Сталін).

НАГНАЦЬ ПРАПУШЧАНАЕ

Апартуністычная недаацэнка аднаразовага збору зрывае выкананьне заданьняў

КУЛАЦКАМУ САБАТАЖУ—РУИНУЮЧЫ АДПОР

ГАНЕБНЫЯ лічбы

Ідучы насустрач патрабаваньням бяднацка-серадняцкіх мас сялянства, урад выдаў закон аб аднаразовым зборы на гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. 70 проц. збору павінна паступіць да 10 лютага, астатняя частка—да 1-га сакавіка г. г. Для кулакоў вызначан адзіны тэрмін уплаты—да 1-га лютага ўсе 100 проц. Каб забясьпечыць сваячасовае паступленьне палічаных сум, закон абавязаў мясцовыя арганізацыі перадаць усе паведамленьні платнікам не пазьней 25-га студзеня.

Як-жа праходзіць рэалізацыя закону аб зборы на мясцох.

Апошнія даныя Наркамфіну БССР сьведчаць аб тым, што кампанія праходзіць вельмі дрэнна. Ёсьць рад раёнаў, дзе паведамленьні платнікам перададзены са значнымі спазьненьнямі, і гэтым самым затрымана сваячасовая ўплата збору.

Слаба разгорнута агітацыйна-растлумачальная работа па папулярызацыі закону, у выніку чаго ствараецца спрыяючая глеба для кулацкай агітацыі супроць збору.

Паводле даных ад 66 раёнаў да 1 лютага з палічаных 5.121.000 руб. паступіла ўсяго 222.000 руб., або... 4,3 проц.

Недапушчальна дрэнна спаганяецца збор з кулакоў. Так, па гэтых раёнах з кулакоў спагнана ўсяго 32.200 руб., або 5,2 проц., прычым з 66 раёнаў—39 раёнаў з кулакоў не спагналі ніадной капейкі.

Ганебныя лічбы. Яны сьведчаць аб праваапартуністычнай практыцы раду мясцовых арганізацый і ў першую чаргу сельскіх саветаў, якія ня хочуць сварыцца з кулаком, не прымушаюць уносіць належачыя з яго плацяжы.

Ёсьць і такія раёны (Бягомльскі, Пэзьненскі, Віцебскі, Вушацкі, Чачэрскі, Чэрвеньскі), якія ўвесь час упарта не паведамляюць як праходзіць у іх кампанія па аднаразовым зборы. Бюракраты з райфінадзелаў прабуюць гэтым захаваць ад кіруючых органаў і грамадзкасьці сваю бяздзейнасьць. «Мандэры» гэтых апартуністаў павінны быць поўнасьцю выкрыты і спатканы самы рашучы адпор. Адпаведныя органы, у першую чаргу раённыя КК РСІ, павінны ваці авіцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да суровай адказнасьці.

Трэба дабіцца рашучага пералому ў рэалізацыі закону аб аднаразовым зборы. Трэба памятаць, што па працягу лютага па БССР павінна паступіць ад збору звыш 7 млн. руб. і што гэта сума ўключана ў фінансавы плян першага кварталу.

Чорная дошка

раёнаў, якія ганебна ня выконваюць заданьняў па аднаразовым зборы.

РАЁН:	% выкананьня плану на 1-II-31 г.
Аршанскі	0,1
Пятрыкоўскі . . .	0,2
Дубровенскі . . .	0,3
Касьцюковіцкі . .	0,3
Рэчыцкі	0,4
Азарыцкі	0,4
Асьвейскі	0,6
Журавіцкі	0,9
Чавускі	0,9
Нараўлянскі . . .	0,9

Наладзіць сыстэматычнае кіраўніцтва раёнамі

Рэалізацыя закону аб аднаразовым зборы ідзе недапушчальна марудна. Тэрмін спагнаньня збору з кулакоў скончыўся яшчэ 1-га лютага, між тым, і да сёнешняга дня кулакі ня ўнесьлі яшчэ належачых з іх плацяжоў. Нявыканана таксама і дырэктыва аб забесьпячэньні да 10 лютага паступленьня 70% аднаразовага збору з працоўнага насельніцтва. Зусім зразумела, што асноўная віна за гэты прарыў прыпадае на мясцовыя арганізацыі, якія ня здолелі мабілізаваць шырокай грамадзкай думкі вакол закону аб зборы, не прымушаюць купацтва ўнесьці сваячасова плацяжы, не даюць рашучага адпору кулацкаму сабатажу і агітацыі супроць збору.

Аднак, ВЯЛІКАЯ ЧАСТКА ВІНЫ ПРЫПАДАЕ І НА НАРКАМФІН БССР, які да гэтага часу не нападзіў ня толькі сыстэматычнага кіраўніцтва гэтай важнейшай кампаніяй, але нават і рэгулярнай сувязі з раёнамі, рэгулярнай інфармацыі з месц і падвядзеньня дзённых або нават пяцідзённых вынікаў кампаніі.

Давопі сказаць, што Наркамфін на сёнешні дзень ня можа даць дакладных вестак аб становішчы гэтай кампаніі на мясцох, аб агульным выкананьні пляну па БССР і аб выкананьні плянаў непасрэдна кожным раёнам.

Мы лічым такое становішча зусім недапушчальным. Наркамфін павінен неадкладна нападзіць сыстэматычнае кіраўніцтва і сувязь з раёнамі. Трэба дабіцца рэгулярнага складаньня апэральных зводак аб ходзе выкананьня заданьняў па аднаразовым зборы. Патрэбны сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы.

Тав. Галадзед на доругім зьезьдзе саветаў Барысаўшчыны

9-га лютага ўвечары адкрыўся чарговы другі раённы зьезд саветаў Барысаўшчыны.

На парадку дня зьезду стаяць наступныя пытаньні: 1. Даклад ураду БССР, 2. Справаздача РВК, 3. Перспэктывы культурнага і гаспадарчага будаўніцтва і зацьвярджэньне бюджэту на 1931 год, 4. Аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, 5. Аб становішчы і разьвіцьці прамысловасьці, 6. Выбары РВК і дэлегатаў на X усебеларускі зьезд саветаў.

Пад гучныя воплескі зьезд выбраў у ганаровыя члены прэзыдыуму членаў Палітбюро ЦК УсеКП(б), старшыню ЦКК УсеКП(б), т. АНДРЭЕВА і т. т. ТЭЛЬМАНА, ЛЕНСКАГА, ГЕЯ, ШАРАНГОВІЧА, ГАЛАДЗЕДА і КАЛНІНА.

На першым-жа пасяджэньні зьезду з дакладам аб дзейнасьці ўраду БССР выступіў т. ГАЛАДЗЕД. Другі дзень работы зьезду амаль цалкам быў прысьвечаны абгаварэньню дакладу т. Галадзеда. У канцы пасяджэньня, пасьля спрэчак і заключнай прамовы т. Галадзеда, зьезд заслухаў справаздачу РВК, якую зрабіў т. ШАПІРА.

10-га лютага, пасьля спрэчак па дакладу аб дзейнасьці ўраду БССР і сваёй заключнай прамовы, тав. Галадзед выехаў у сувязі з адкрыцьцём усебеларускага зьезду Асавіяхіму ў Менск.

Да „міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем"

ПРЫ КАПІТАЛІЗЬМЕ НЯМА ВЫХАДУ З ГОЛАДУ І ГАЛЕЧЫ

ЗАМЕСТ „ХЛЕБА І ПРАЦЫ"—ГУМОВЫЯ ПАЛКІ І КУЛІ

ВЫСТУПЛЕНЬНІ БЕСПРАЦОЎНЫХ У КРАЯХ КАПІТАЛУ ПРЫМАЮЦЬ УСЕ БОЛЬШ БУРНЫ ХАРАКТАР

Адозва камсамолу Нямеччыны

БЭРЛІН. Камуністычны саюз моладзі Нямеччыны і юнацкая сэкцыя разваліўшчынай прафапазыцыі зьвярнуліся з супольнай адозвай да ўсёй працоўнай моладзі аб падрыхтоўцы ДА «МІЖНАРОДНАГА ДНЯ БАРАЦЬБЫ З БЕСПРАЦОЎЕМ» — 25-га ЛЮТАГА.

Адозва паказвае, што ва ўсім сьвеце налічваецца больш 25 мільёнаў беспрацоўных. У Нямеччыне армія беспрацоўных дасягнула 5 млн. і, акрамя таго, 3 млн. рабочых працуюць скарочаны час. Без работы знаходзіцца больш аднага мільёна працоўнай моладзі і скарочаны тыдзень працуюць — 600 тыс. маладых рабочых.

— Гапеча працоўнай моладзі, — адзначае адозва, — павялічваецца з кожным днём. НЯ МАЮЧЫ НАДЗЕІ АТРЫМАЦЬ У КАПІТАЛІСТЫЧНЫМ СЬВЕЦЕ РАБОТУ, ШМАТ МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ КАНЧАЮЦЬ САМАГУБСТВАМ. Вынікам дзейнасьці ўраду Брунінга зьяўляецца скарачэньне выдаткаў на сацыяльныя патрэбы, у асаблівасьці выдаткаў на дапамогу для беспрацоўных.

Сацыял - дэмакратычная партыя і саюз сацыял - дэмакратычнай моладзі—гаворыцца далей у адозьве,—прапануюць для паслабленьня беспрацоўя на адзін год падаўжыць заняткі ў школах, увесьці прымусовую працу, і наогул усякім чынам падтрымліваюць мерапрыемствы буржуазіі, накіраваныя супроць беспрацоўнай моладзі. Нацыянал-сацыялісты (фашысты) патрабуюць увядзеньня працоўнай павіннасьці і прымусовай працы і заспакайваюць беспрацоўных пэрспэктывамі іх «трэцяй імпэрыі».

— У капіталістычным сьвеце, — канстатуе адозва, — НЯМА НІЯКАГА ВЫХАДУ З ГОЛАДУ І ГАЛЕЧЫ. Капіталістычная сыстэма ня ў стане больш гарантаваць рабочай клясе нават мінімуму для існаваньня. ПРЫ ДАПАМОЗЕ ГУМОВЫХ ПАЛАК І КАРАБІНА КАПІТАЛІСТЫ ДУМАЮЦЬ УСТАНАВІЦЬ СПАКОЙ І ПАРАДАК. Мы павінны мабілізаваць усю беспрацоўную і працоўную моладзь супроць масавай эксплёатацыі і юнгаўскага грабежніцтва і арганізаваць адзіны фронт усіх сацыял-дэмакратычных, каталіцкіх, фашысцкіх і беспартыйных маладых рабочых і правесьці такім чынам міжнародны дзень беспрацоўных — 25 лютага.

Адозва канчаецца спэкамі: «Ня гледзячы на забарону, 25-га лютага павінны адбыцца буйнейшыя дэманстрацыі. Мы павінны расказаць працоўнай моладзі, як жыве моладзь у Савецкім Саюзе, дзе няма беспрацоўя. 25-га лютага мы павінны таксама мабілізаваць рабочую моладзь для абароны Савецкага Саюзу».

Забастоўка--пратэст партовых рабочых у Гамбургу

БЭРЛІН, 11. У Гамбургу адбыўся шматлюдны сход партовых рабочых. Сход аднагалосна пастанавіў абвясьціць, пачынаючы з сярэды 11 лютага, забастоўку ў Гамбургскім парту супроць зьніжэньня зарплаты. Прафсаюзная бюракратыя ўсімі сіламі прабуе перашкодзіць правядзеньню забастоўкі.

Бурнае пасяджэньне нямецкага рэйхстагу

БЭРЛІН, 10. Учарайшае пасяджэньне рэйхстагу было выключна бурным. На парадку дня стаялі прапановы аб зьмене рэгляманту рэйхстагу, якія ў першую чаргу накіраваны супроць кампартыі. Камфракцыя разгарнула самую жорсткую абструкцыю і на працягу трох тадзін яна перашкаджала абгаварэньню гэтых прапаноў. Вышэйшага пункту абурэньне дасягнула, калі выступаўшы з абгрунтаваньнем прапанаваных зьмен рэгляманту дэпутат ад партыі цэнтру Бэл заявіў, што ён гаворыць і ад імя сацыял-дэмакратычнай партыі.

Камдэпутат тав. Вальтэр падышоў да старшыні рэйхстагу сацыял-дэмакрата —Лёбэ і перадаў яму паліцэйскую каску і гумовую дубінку, са словамі: «я ўручаю старшыні сымбалі нямецкай рэспублікі і парадку».

Лёбэ выключыў Вальтэра і яшчэ некалькіх камдэпутатаў на два тыдні. Камфракцыя адказала на гэта воклічамі: «прыслужнік Брунінга». «Прач рэйхстаг». Камдэпутат Кэнэн у сваёй прамове зьвяртаўся да сацыял-дэмакратычных рабочых, падкрэсьліваючы, што сацыял-дэмакратычныя правадыры адкрыта сталі ў рады фашыстаў. Пры бурнай і шумна прапёкшай абструкцыі камфракцыі, рэйхстаг прыняў шэрны пункт прапаноў аб зьмене рэгляманту.

Пасьля гэтага камфракцыя пакінула ў знак пратэсту залю пасяджэньняў. Пасяджэньне працягвалася да раніцы, пры чым пачалося ўжо абгаварэньне пункту аб абмежаванасьці дэпутацкай недатыкальнасьці.

Дэманстрацыя камуністаў у чэскім парляманце

ПРАГА, 11. Тав. Грубы, які выступаў ад імя камфракцыі, сказаў у парляманце прамову, прысьвечаную памяці ахвяр расстрэлу ў Дуксе 4-га лютага. Камуністычныя дэпутаты выслухалі прамову стоячы. Па скончэньні прамовы камуністычныя дэпутаты разьвінулі «Інтэрнацыянал». Нэгэрэнор прапанове старшыні парляманту, які прасіў буржуазнага прамоўцу гаварыць далей, апошні маўчаў пакуль камуністычныя дэпутаты ня скончылі сьпеву 4-х радкоў «Інтэрнацыянала».

Рэвалюцыйны рух сялянства ў Польшчы

ЖОРСТКІЯ СУТЫЧКІ З ПАЛІЦЫЯЙ У ПОЛЬСКІХ ВЁСКАХ

ВАРШАВА, 9. Рэвалюцыйны рух сярод малазямельнага сялянства ў Польшчы расьце і з кожным днём захоплівае ўсё новыя і новыя раёны. Ва многіх вёсках сяляне аказваюць рашучае супраціўленьне судовым выканаўцам, якія прабуюць прадаваць з аўкцыёну сялянскую жывёлу і інш. маемасьць за няўплату падатку. За апошнія часы ў цэлым радзе раёнаў адбыліся масавыя мітынгі, арганізаваныя левай сялянскай арганізацыяй «Самадапамога». У вёсцы Конская - воля, Пулаўскага павету, адбыўся мітынг з ТЫСЯЧ СЯЛЯН, на якім выступіў дэпутат «Самадапамогі» Ткачук. Сяляне выступілі на абарону рэвалюцыйнага дэпутата супроць паліцыі, ЗЬВІТУШЫ ПРЫ ГЭТЫМ НЕКАЛЬКІХ ПАЛІЦЭЙСКІХ. Дэманстрантаў разагналі тэрмінова выкліканыя паліцэйскія падмацаваньні. На наступны дзень у тым-жа павеце ў вёсцы ОПОЛЕ адбыўся мітынг, на які зьявілася ЗВЫШ 10 ТЫС. СЯЛЯН. Паліцэйскіх агентаў, якія прабавалі сарваць мітынг, сяляне зьбілі і прагналі. Рух малазямельных сялян ахоплівае ўсё новыя раёны.

Ухвала рэвалюцыі пры дапамозе паліцэйскіх дубінак

ВЕНА, 10. У Будапэшце (Вэнгрыя) адбыўся зьезд рэфармісцкіх прафсаюзаў. У парадку дня стаяла пытаньне аб барацьбе з беспрацоўем. Сярод дэлегатаў было шмат прадстаўнікоў рэвалюцыйнай прафапазыцыі, якія перашкодзілі прафбюракратам выкарыстаць зьезд для адцягненьня ўвагі рабочых мас ад правядзеньня міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем 25 лютага. Прэзыдыум зьезду прапанаваў «паслаць апошняе папярэджаньне ўраду і адначасова стараўся перашкаджаць выступленьню рэвалюцыйных дэлегатаў».

Апошнія, аднак, дабіліся слова, патрабавалі арганізаваць рэвалюцыйныя вулічныя дэманстрацыі супроць ураду і выкрывалі манэўры рэфармісцкіх лідэраў. Сац.-дэмакратычныя лідэры дарэмна прабавалі ўсялякімі мерамі запалохаць рэвалюцыйных прамоўцаў. Частка дэлегатаў крычала хорам: «Далоў прымірэнцаў, выйдзем на вуліцу, арганізуем новае першае верасьня».

Прэзыдыуму толькі з вялікім трудом пры дапамозе паліцыі ўдалося ўхваліць рэзалюцыю, у якую пад націскам мас рэфармісты прымушаны былі ўставіць радыкальныя лёзунгі аб барацьбе супроць ураду. (ТАСС).

Страшэнная галеча сярод беспрацоўных Чэха-Славакіі

ПРАГА. Камдэпутат тав. Крэснарж выступіў у чэха-славацкім парляманце з вялікай прамовай аб становішчы беспрацоўных. «Кожны пяты рабочы Чэха-Славакіі, сказаў тав. Крэснарж, выкінуты на брук, сотні тысяч працуюць пяпоўны тыдзень. Павышаюцца падаткі і мыты на прадметы шырокага ўжытку, скарачаецца зарплата. У рабочых сем'ях панутае жудасная галеча, якой вы, сытыя, ня хочаце заўважаць. З кожным днём памнажаюцца выпадкі самагубстваў. Сацыял-фашысцкія міністры стараюцца супакоіць беспрацоўных, запэўніваючы іх, што з лютага іх становішча значна палепшыцца, але ў той-жа час дапамогі беспрацоўным зьніжаюцца з 10-20 чэскіх крон да 5-10. Тысячы беспрацоўных не атрымліваюць зусім дапамог вось ужо два тыдні. Падзьдзе ў вёску, там вы ўбачыце тую-ж галечу. Абурэньне працоўных мас вялізарнае. Таму ўлада ўжывае ўсякія папераджальныя меры. Ва многіх рабочых цэнтрах паліцыя не дазваляе спыняцца на вуліцы нават двум грамадзянам. Беспрацоўныя, супольна з працоўнымі рабочымі і сялянамі, павінны змагацца супроць існуючага ў Чэха-Славакіі рэжыму. Барацьба ідзе не за абедзеныя талёны, а за працу, хлеб і ўладу».

Штыкавая атака жандар мэрыяй беспрацоўных

ПРАГА. У Ядоўніцах узброеныя жандары ўварваліся ў памяшканьне, дзе адбываўся сход беспрацоўных і пусьцілі ў ход штыкі. Усё памяшканьне разгромлена. Паранена 4 рабочых.

Забарона рабочых дэманстрацый у дзень 25 лютага ў Баўгарыі

ВЕНА, 8. Паводле вестак з Сафіі, міністар унутраных спраў забараніў арганізоўваць 25 лютага ня ў там ні было дэманстрацыі і сходы. Забарона тлумачыцца тым, што міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем «арганізоўваецца Камінтэрнам». Міністар аб'явіў, што агітацыя за выступленьне беспрацоўных 25 лютага і ўсякая падрыхтоўка да гэтага дня будзе прасьледавацца на падставе законаў аб абароне дзяржавы. (ТАСС).

4.894.333 беспрацоўных у Нямеччыне

БЭРЛІН, 10. Колькасьць беспрацоўных, зарэгістраваных у аддзелах працы, складала на 31 студзеня 4.894.333 чал.

Бурныя дэманстрацыі беспрацоўных у Будапэшце

150 ЧАЛАВЕК АРЫШТАВАНА

ВЕНА, 10. Як паведамляюць з Будапэшту, паліцыя, прабуючы папярэдзіць дэманстрацыю, якая чакалася, арыштавала многіх рабочых за распаўсюджваньне лістовак кампартыі. Паліцэйскія патрулі былі ўзмоцнены. Аднак, ня гледзячы на паліцэйскі тэрор, беспрацоўныя сабраліся, потым радамі пашлі да бульвараў, дзе адбылася дэманстрацыя пад лёзунгамі кампартыі. Дэманстранты рабілі спробу пранікнуць у ратушу, але былі разагнаны паліцыяй. Потым дэманстранты сабраліся перад памяшканьнем рэдакцыі сацыял-дэмакратычнай газэты «Нэпсава» і арганізавалі бурную дэманстрацыю супроць сацыял-фашыстаў. Паліцыя разагнала дэманстрантаў дубінкамі. Арыштавана паўтараста чал.

Згуртоўваць рады да барацьбы з фашызмам

БЭРЛІН, 10. У Гамбургу адбыўся зьезд па барацьбе з фашызмам. У буйнейшым памяшканьні Гамбургу сабралася 2.000 дэлегатаў, у тым ліку сотні беспартыйных і сацыял-дэмакратычных рабочых. Прадстаўнік жаменкай кампартыі тав. Рэммэле выступіў з дакладам аб задачах барацьбы супроць фашызму.

У дыскусіі ўдзельнічала 22 прадстаўнікі ад фабрычна-заводзкіх рабочых, беспрацоўных, рамесьнікаў, жонак рабочых і малазямельных сялян. 69 дэлегатаў заявілі аб уступленьні ў нямецкую кампартыю. 47 членаў сацыял-дэмакратычнай арганізацыі «рэспубліканскага сьцягу» і сацыял-дэмакратычнага саюзу рабочай моладзі выступілі з суменнай дэкларацыяй, у якой заклікаюць да стварэньня адзінага рэвалюцыйнага фронту працоўных для абароны Савецкага Саюзу.

Французская паліцыя рыхтуецца да 25 лютага

ПАРЫЖ, 9. Французкая фашысцкая газэта «Амі дэю Пэпль» друкуе артыкул аб находзячым міжнародным дні барацьбы з беспрацоўем — 25-га лютага. Газэта лічыць, што найбольш бурнае выступленьне беспрацоўных трэба чакаць у Англіі і ў Паўночна - Амэрыканскіх Злучаных Штатах. Яна спадзяецца, што ў Францыі дзень 25-га лютага не адзначыцца «асабліва цяжкімі сутычкамі». «Урад, — піша газэта, — ва ўсякім выпадку павінен давесьці, што ён можа падтрымаць парадак на вуліцы». Далей газэта паведамляе, што прадбачыцца пераарганізацыя паліцыі (якая вядзіцца да сфармаваньня буйных паліцэйскіх часьцей для змаганьня з рэвалюцыйнымі выступленьнямі пралетарыяту) і што гэта пераарганізацыя будзе каштаваць Парыжу 98 мільёнаў франкаў (франк каля 8 кап.).

Заклік французскіх гарнякоў

ПАРЫЖ. Фэдэрацыя унітарных (рэвалюцыйных) прафсаюзаў гарнякоў зьвярнулася з адозвай да ўсіх гарнякоў, заклікаючы 25-га лютага ў міжнародны дзень барацьбы супроць беспрацоўя ў краінах капіталу арганізаваць магутныя дэманстрацыі на ўсіх капальнях і ва ўсіх каменна-вугальных раёнах Францыі. Адозва падкрэсьлівае, што ў сучасны момант у Францыі звыш 300 тыс. гарнякоў пакутуюць ад часткавага беспрацоўя, якое прывяло да значнага зьніжэньня зарплаты.

ПРАВАДЫР „ГРАМАДЫ" Б. ТАРАШКЕВІЧ— У КІПЦЮРОХ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

ЯК ПАВЕДАМЛЯЕ ПОЛЬСКІ ДРУК, У ВЕЛЬМІ ТАЯМНІЧЫХ АКАЛІЧНАСЬЦЯХ У ПОЛЬСКІМ КАЛДОРЫ НА СТАНЦЫІ ЖЧЭЎ У ЭКСТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫМ ВАГОНЕ НЯМЕЦКАГА ЦЯГНІКА АРЫШТОВАН БЫЛЫ ДЭПУТАТ ПОЛЬСКАГА СОЙМУ БРАНІСЛАЎ ТАРАШКЕВІЧ — АДЗІН З ПРАВАДЫРОЎ СТОТЫСЯЧНАЙ БЕЛАРУСКАЙ РАБОТНІЦКА-СЯЛЯНСКАЙ ГРАМАДЫ, РАЗГРОМЛЕНАЙ ПОЛЬСКІМ ФАШЫЗМАМ. Б. ТАРАШКЕВІЧ ПА СПРАВЕ ГРАМАДЫ БЫЎ У СВОЙ ЧАС АСУДЖАН ПОЛЬСКІМ ФАШЫСТАЎСКІМ СУДОМ НА 6 ГОД КАТАРГІ. ПАСЛЯ 3 ГОД ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ Ў ТУРМЕ ВРОЦКІ ФАШЫСТАЎСКІ ЎРАД АСЛАБАНІЎ ТАРАШКЕВІЧА, РАЗЬЛІЧВАЮЧЫ, ШТО ЯМУ ЎДАЛОСЯ ЗЛАМАЦЬ ТАРАШКЕВІЧА І ВЫКАРЫСТАЦЬ ЯГО Ў СВАІХ МЭТАХ. ФАШЫСТАЎСКІ ЎРАД ПАМЫЛІЎСЯ. ТАРАШКЕВІЧ МУЖНА ВЫСТУПІЎ СУПРОЦЬ АКУПАНТАЎ ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ІХ БЕЛАРУСКІХ ЛЕКАЯЎ — НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТАЎ. ФАШЫСТАЎСКІ ЎРАД ПАЧАЎ РЫХТАВАЦЬ НОВЫЯ ПРАЦЭСЫ СУПРОЦЬ ТАРАШКЕВІЧА. Б. ТАРАШКЕВІЧ ВЫЕХАЎ У НЯМЕЧЧЫНУ І АДСЮЛЬ ПРАЦЯГВАЎ БЯЗУПЫННУЮ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ФАШЫСТАЎСКАГА ЛАДУ І ПОЛЬСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

АРЫШТАВАНЫ Ў ТАЯМНІЧЫХ АКАЛІЧНАСЬЦЯХ ТАРАШКЕВІЧ ПА ЗАГАДУ СУДЗЬДЗІ СЬЛЕЧАГА — А НА СПРАВЕ ПА ЗАГАДУ ФАШЫСЦКАЙ АХРАНКІ (ДЭФЭНЗЫВЫ) ПАСАДЖАН У ТУРМУ ПАНЯРЭДНЯГА ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ Ў ВАРШАВЕ. СПРАВА ТАРАШКЕВІЧА ДАРУЧАНА СЬЛЕДЧАМУ КВЯТКОЎСКАМУ, ЯКІ

РАБОТУ УСІХ РАЁНАЎ—

на вышыню задач завяршэньня пабудовы ў гэтым годзе фундаманту сацыялістычнай эканомікі

Выкарчоўваючы апартуністычную практыку ў рабоце, узмацняць кіруючыя апараты кадрамі, здольнымі па-бальшавіцку ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі

Трукі прэтэндэнтаў...

Параўнальна нядоўгая практыка работы раёнаў пасьля ліквідацыі акруг паказвае, што гэта рэарганізацыя поўнасьцю сябе апраўдала. Раёны значна ўзмоцнены кіруючымі кадрамі за лік работнікаў ліквідаваных акруговых устаноў, установы пераведзены ў асноўным на функцыянальную сыстэму, значна палепшылася кіраўніцтва нізавымі зьвенямі партыйных арганізацый, савецкіх, каапэрацыйных і інш. устаноў.

У часе пасылкі акруговых работнікаў у раёне мы мелі нямала недапушчальных фактаў ухіленьня раду акруговых работнікаў ад працы ў раёне, былі факты яўнага дэзэртырства з адказнага фронту клясавага змаганьня ў вёсцы. Некаторыя з акруговых работнікаў вельмі неахвотна ішлі на «зьнижэньне чыну» і пад усякімі прычынамі імкнуліся застацца на рабоце ў гарадзкіх ці цэнтральных установах.

Да такіх «нехацімцаў» адносяцца партыйцы **Рубінчык і Крылавіцкі**, якія займалі адказныя пасады ў савецкіх установах б. Мазырскай акругі. Яны, як і шмат «алілуйшчыкі», на форме ня былі супроць пастановы партыі аб ліквідацыі акруг і ўзмацненьні раёнаў, як асноўнага зьвяна сацыялістычнага будаўніцтва. Яны ўхвалялі і галасавалі за гэту пастанову, але, калі справа дайшла да канкрэтнага вырашэньня, Рубінчык і Крылавіцкі пачалі «вілаць», ухіляцца ад паездкі ў раён на пастаянную работу. Толькі пад рашучай уезьдзейнасьцю партыйных органаў (Крылавіцкі выключаўся з партыі), Рубінчык і Крылавіцкі былі прымушаны паехаць у раён.

Гэтым «лякіраваным» камуністам не спадабаліся ўмовы работы ў **Жыткавіцкім раёне**. Будучы захопленымі «маніей вождызма», з першых крокаў іх работы, адчувалася нездавальненьне... пасадамі. За кароткі час (3-4 месяцы) знаходжаньня ў раёне Рубінчык, гастралюючы з месца на месца, зьмяніў 6 пасад у розных установах.

Як Рубінчык, так і Крылавіцкі замаскавана сабатавалі выкананьне дырэктыў раённага партыйнага і савецкага кіраўніцтва. Яны паставілі перад сабой мэту двойчага парадку: дабіцца заняцьця пасад раённых кіраўнікоў ці зусім вызваліцца ад работы ў раёне.

Для ажыцьцяўленьня гэтай мэты Рубінчык і Крылавіцкі становяцца на шлях кампраматацыі раённага кіраўніцтва. Ведаючы якое вялікае значэньне надае партыя вылучэньню, прэтэндэнты на «вождызм» зьбіраюць ад вылучэнцаў скаргі на раённае кіраўніцтва, праяўляючы вялікую старанасьць у зьбіраньні нясноўных фактаў бюракратызму і заціску самакрытыкі з боку РК і РВК. Праўда, рабочыя - вылучэнцы скардзіліся на адсутнасьць належнай дапамогі у іх рабоце, няўважлівасьць да стварэньня спрыяючых жыцьлёвых умоў, але не гаварылі таго, чаго хацелі Рубінчык з Крылавіцкім для ўдару па раённым кіраўніцтве.

Аднак, Рубінчыку ўдалося абцяпаць справу, ён над сваёй заявай (якой сам не падпісаў) аб няздольнасьці раённага кіраўніцтва і заціску самакрытыкі сабраў некалькі подпісаў вылучэнцаў. Даведаўшыся аб дзейнасьці Рубінчыка, жыткавіцкая абыватальшчына далучылася ў ліку 14 чалавек да скаргі на раённае кіраўніцтва.

Высьвятленьнем гэтага пытаньня займалася раённая кантрольная камісія, склікалася партыйная нарада, якія прызналі, што заявы не адпавядаюць сапраўднасьці. Партыйная нарада падкрэсьліла, што жыткавіцкае раённае кіраўніцтва ажыцьцяўляе задачы партыі ў вёсцы. У раёне калектывізавана 31% бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, збожжазагатоўкі выкананы на 125%, рэалізавана пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» на 122%, а посьпехам выконваецца і рад іншых гаспадарча-палітычных кампаній. Усё гэта дасягнута ў базьбітасным змаганьні з клясавым ворагам і яго агентурай у радах партыі—правым і «левым» апартунізмам. Ніякіх фактаў заціску самакрытыкі з боку раённага кіраўніцтва не ўстаноўлена.

Аказваецца, што кампанія супроць раённага кіраўніцтва праводзілася не ў інтарэсах зьнішчэньня недахопаў, а ў асабістых інтарэсах Рубінчыка і Крылавіцкага, прэтэндуючых на больш адказныя пасады.

Дэзарганізатары работы, сабатаўшыя выкананьне дырэктыў раённага кіраўніцтва ў бяспрынцыпнай барацьбе за «партфэль», павінны атрымаць па заслугах.

П—к.

Кіраўніцтва Вузьдзенскага раёну—

у баку ад важнейшай задачы

Пасьля ліквідацыі акруг Вузьдзенскі раён часткова ўзмоцнены кадрамі кіруючых раённых работнікаў. Аднак, работа раённых апаратаў у непастарчальнай меры адпавядае задачам рэканструкцыйнага пэрыяду. Раённыя ўстановы (райком, РВК, райкалгасаюз і інш.) стаяць часамі ў баку ад правядзеньня важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Напрыклад, **справаздачна-перавыбарчая кампанія калгасаў прайшла ў раёне бяз удзелу і кіраўніцтва як з боку райкому, так і райкалгасаюзу.** Гэта пытаньне нават не абмяркоўвалася на бюро райкому, ня былі мабілізаваны раённыя работнікі для пасылкі ў калгасы на час справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Такім чынам, гэта кампанія прайшла самацёкам і не дала патрэбных вынікаў у сэнсе арганізацыі ў раёне новых калгасаў і прыліву ў існуючыя.

Адсутнасьць удзелу ў гэтай кампаніі раённага актыву сакратар РК тав. Паромчык апраўдвае: «Ну што-ж рабіць, калі мы ўсе заняты, няма кадраў, і дзе сам ня зробіш, дык нічога і няма».

Вядома, што справа не ў адсутнасьці кадраў, справа не ў асаблівай іх перагрузцы, а **справа ў няўменьні арганізаваць работу**, перабудаваць яе ў адпаведнасьці з асноўнымі задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Слабое кіраўніцтва з боку раённых устаноў, пазбаўляе апартуністычнай практыкі ў рабоце раду парт'ячэек, сельсаветаў і некаторых раённых устаноў—зьяўляюцца асноўнай перашкодай у справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Калі ў раёне калектывізавана на сёнешні дзень каля 16 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, дык далейшая работа ў гэтым напрамку праводзіцца вельмі слаба. На мясцох пануюць настроі самацёку. За апошнія два месяцы ўступіла ў калгасы толькі 14 гаспадарак. Гэта тлумачыцца тым, што раённае кіраўніцтва недаацаніла важнасьці справаздачна-перавыбарчай кампаніі калгасаў, не забясьпечыла ўздыму гэтай кампаніі на палітычную вышыню, ня выкарыстала яе ў сэнсе арганізацыі новага калгаснага прыліву. За час гэтай кампаніі вычышчаны з калгасаў толькі 2 кулакі, а зараз выяўлена, што кулакі ёсьць амаль у кожным калгасе.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы таксама прадастаўлена поўнаму самацёку. Першаначатковая работа на складаньні фуражных фондаў, па рамонце інвэнтару, на стварэньні насенных фондаў і г. д. не разгорнута. На складах райкаапсаюзу ляжаць сельска-гаспадарчыя машыны, у якіх адчуваецца вострая патрэба, а калгасы іх не бяруць па матывах адсутнасьці сродкаў.

З боку раённага кіраўніцтва не аддаецца належнай увагі спэцыялізацыі калгасаў. Пляны будаўніцтва ў калгасах і ўкамплектаваньне іх жывёлай сарваны. Арганізацыя працы ў калгасах пастаўлена вельмі кепска, у выніку чаго ў радзе калгасаў назіраецца безгаспадарчасьць. У некаторых калгасах ня ўбралі шмат кармоў.

Наколькі слаба праводзіцца работа партыйнымі ячэйкамі па ўзмацненьні існуючых калгасаў і арганізацыі новых, відаць з таго, што арганізаваныя камісіі садзейнасьці калектывізацыі зусім нічога ня робяць і ніхто імі ня кіруе. У раёне ёсьць толькі адна ініцыятыўная група, але ініцыятывы ў ёй ніякай няма, бо яна нічога ня робіць.

Аб усіх гэтых недахопах у калгасным будаўніцтве гаварылі калгаснікі на раённым зьезьдзе, які адбыўся 7-га лютага. Трэба адзначыць, што на зьезьдзе калгаснікаў нават ня было прадстаўніка ад райкому партыі. Пытаньні, якія абмяркоўваліся на зьезьдзе, ня былі пастаўлены на бюро РК. У часе абмеркаваньня зьездам адозвы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб кантрактацыі мелі месца апартуністычныя выступленьні партыйцаў **Ліпая і Кантаровіча**, якія імкнуліся даказаць немагчымасьць выкананьня плянаў па кантрактацыі і лесазагатоўках. Гэтым **апартуністам далі рашучы адпор радавыя калгаснікі.**

Тыя факты, што важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі, як справаздачна-перавыбарчая кампанія калгасаў і раённы выезд калгаснікаў, праходзілі бяз удзелу і кіраўніцтва райкому, сьведчаць аб апартуністычнай недаацэнцы раённым партыкіраўніцтвам пытаньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Ніякія разважаньні аб адсутнасьці патрэбнай колькасьці кіруючых кадраў ня могуць апраўдаць апартуністычнай практыкі ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

СКАВІНСКІ.

Раённы апарат не перабудаваў сваёй работы

Апартуністычная практыка не сустракае рашучага адпору

Бешанковіцкі раён у сваёй гісторыі два разы меў рэарганізацыю ў сэнсе тарытарыяльнага пашырэньня, узмацненьня кіруючымі работнікамі і перабудовы работы: першы раз у часе рэарганізацыі былой Віцебскай акругі і другі—у сувязі з ліквідацыяй акруг. Аднак, дырэктывы партыі ў гэтым напрамку засталіся навыкананымі ва умовах гэтага раёну і да сёнешняга дня. Праведзена перайменаваньне некаторых аддзелаў РВК, рэарганізацыя раённых устаноў, а работа іх не перабудавана ў адпаведнасьці з задачамі найлепшага забесьпячэньня выкананьня дырэктыў партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Функцыянальная сыстэма засталася на паперы. Плянавая камісія, якая пасьля ліквідацыі акруг павінна адыгрываць вялікую ролю, у раёне ня існуе па прычынах адсутнасьці плянавіка.

Пасьля ліквідацыі акруг раён не атрымаў ні аднаго кваліфікаванага работніка. Вялікі недахват у раёне адчуваецца ў спэцыялістах. Як раней быў толькі адзін агранам у раёне, так і зараз лік іх не павялічыўся.

Уся работа раённага камітэту партыі ўзвалена на аднаго аноара. Сакратар РК знаходзіцца на курсах, а іншых асноўных работнікаў райкому няма. Частка кіруючых работнікаў выехала з раёну быццам-бы вучыцца, але некаторыя з іх замест вучобы засталіся на рабоце ў цэнтральных установах.

У рабоце раённых устаноў пераважнае месца аддаецца пасяджэньням, выпрацоўкам пастаноў і зусім мала зварачаецца ўвагі на выкананьне гэтых пастаноў, на праверку іх ажыцьцяўленьня на мясцох. Калі даходзіць справа да пасылкі раённага актыву ў сельсаветы, дык прыходзіцца часта сустракацца з адмаўленьнямі ад паездкі па розных матывах перагружанасьці ў выкананьні непасрэдная работы ў тэй ці іншай раённай установе.

Райком пастановай ад 16 студзеня прызначыў 12 актывістаў для паездкі ў сельсаветы, але ў вызначаны тэрмін ня выехала нават і палова таварышоў. Гэты факт не зьяўляецца выключэньнем. Адвільваньне ад работы з боку раду адказных кіруючых работнікаў—ня рэдкае зьявішча ў Бешанковіцкім раёне. За апошні час выяўлена група ў партыйнай арганізацыі, якая калектыўна рыхтавала заяву аб выхадзе з партыі па матывах нездавальненьня іх (асоб гэтай групы) службовым становішчам.

У рабоце раду ячэек Бешанковіцкай раённай партарганізацыяй праводзіцца апартуністычная практыка. Калі збожжазагатоўкі выкананы зараз на 108 проц. у раёне, дык цьвёрдыя заданьні з кулацкіх і заможных гаспадарак ящчэ да гэтага часу не спагнаны. Груба скажаюцца дырэктывы партыі і ўрады ў сэнсе выкананьня ільназагатовак. **У большасьці сельсаветаў да гэтага часу ня былі даведзены да кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдыя заданьні па ільназагатоўках.** Кіраўніцтва калгасу «Перамога» (Новікаўскі сельсавет) замест выкананьня заданьняў па ільназагатоўках разьмеркавала ільнавалакно паміж калгаснікамі, надзяляючы па 8-16 клг. валакна кожную сям'ю.

У рабоце некаторых ячэек і паасобных камуністаў адсутнічае клясавы прыцыцп, сілянгства ацэньваецца бяз усякай клясавай дыфэрэнцыяцыі, шырока распаўсюджаны былі разважаньні, што «кулакоў у раёне няма». На справе ж з выяўленых за апошні час 50 кулацкіх гаспадарак многія гаспадаркі ў мінулыя гады абкладаліся сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку.

Апартуністычная практыка паасобных ячэек і сельсаветаў узмацняла пазыцыю клясавага ворага. Кулацтва аказала свой уплыў на найбольш адсталую частку ня толькі сераднякоў, а нават і беднякоў. У гэтым раёне мелі месца такія факты, калі ў паасобных населеных пунктах і сераднякі і беднякі адмаўляліся даводзіць цьвёрдыя заданьні на загатоўках да кулацка-заможных двароў.

Калектывізацыя ў раёне праходзіць самацёкам, што сьведчыць аб невыстарчальнай барацьбе з апартунізмам.

Бешаковіцкая партарганізацыя не забясьпечыла пасьпяховага правядзеньня важнейшай палітычнай кампаніі—перавыбараў сельсаветаў. У выніку бязьдзейнасьці многіх ячэек у гэтай справе на мабілізацыі калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас на бязьлітаснае змаганьне з кулацтвам, у выніку апартуністычнай недаацэнкі работы з беднатой 90 кандыдатур, рэкамэндаваных ячэйкамі ў склад сельсаветаў, ня былі выбраны. Колькасьць камуністаў у складзе сельсаветаў у параўнаньні з мінулым годам панізілася на 0,7 проц. і камсамольцаў—на 1,5 проц. Процант жанчын у складзе сельсаветаў (17,5) у параўнаньні з мінулым годам нікольні не павялічыўся.

Такія буйныя прарывы ў рабоце Бешанковіцкай партарганізацыі ў радзе важнейшых вучасткаў патрабуюць тэрміновага рэагаваньня з боку адпаведных цэнтральных органаў як у справе дапамогі арганізацыі ачысьціцца ад апартуністычных элемэнтаў, так і ў справе ўзмацненьня гэтага раёну кіруючымі кадрамі работнікаў.

А. Вайцок.

Дабіцца рашучага пералому ў рабочым шэфстве над дзяржапаратам

Шэфства—гэта форма масавага арганізаванага кантролю зьнізу, якая вырасла на аснове ўзросшай актыўнасьці рабочай клясы, на аснове гаспадарчага ўздыму нашай краіны і наступленьня на капіталістычныя элемэнты—зьяўляецца адным з лепшых відаў удзелу рабочых у кіраваньні дзяржаўным апаратам. У рэзалюцыі XVI партыйнага зьезду па справаздачным дакладзе ЦКК гаворыцца:

«Асноўная задача шэфства павінна заключаецца ў штодзённым кантролі з боку заводаў-шэфаў над выкананьнем падшэфным апаратам важнейшых дырэктыў партыі і ўраду, штодзённым азнаёмленьні рабочых з практычнай работай установы, з тым, каб скласьці магутныя рэзервы новых пралетарскіх кадраў для пастаяннай работы ў савецкім апараце. Шэфства, як масавы пралетарскі рух, накіраванае на паляпшэньне работы савецкага апарату, павінна знайсьці выключнае падтрыманьне і дапамогу з боку ўсіх арганізацый».

Большасьць нашых партыйных і прафэсыянальных арганізацый яшчэ далёка не дабіліся належнага пералому па ажыцьцяўленьні рабочага кантролю ў штодзённай рабоце дзяржапарату.

Ёсьць выпадкі простай недаацэнкі значэньня рабочага кантролю. Вось факты:

Па лініі ЦСПСВ праводзілася абсьледваньне работы **саюзу саўгандальслужачых.** З гэтага агляду яўсім выпала рабочае шэфства. Забылі заняцца такой «дробязьзю», як рабочы кантроль над дзяржапаратам. А пытаньні масавага кантролю больш за ўсё датычаць іменна саюзу саўгандальслужачых, і кіруючы склад яго павінен быць зацікаўлен гэтай галінай работы.

У ЦСПСВ справа рабочага шэфства павінен займацца масавы сэктар, але нейкім чынам гэты вучастак масавай работы трапляе ў сэктар кадраў. Работнікі сэктару кадраў заяўляюць, што гэта работа ня іх, а масавага сэктару.

Такім чынам, пакуль што рабочае шэфства па прафсаюзнай лініі—«бяспрытульнае». Прэзыдыуму ЦСПСВ трэба пераглядзець гэта пытаньне, перадаць адказьнейшы вучастак масавай работы таму, каму належыць.

Некалькі слоў аб кіраўніцтве рбочым шэфствам. Завод **«Дрэваапрацоўшчык»** шэфствуе над **Лесбелам.** Некалькі дзён таму назад запыталіся ў сакратара партколектыву заводу, як ажыцьцяўляецца шэфства над установай. Ён адказаў:

—Намі ў гэтай справе нічога ня робіцца, ніякай работы па кантролі над Лесбелам няма. Шэфства афіцыяльна прынялі і далей—ні кроку!

Са слоў сакратара відаць, што рабочым-шэфам быццам няма чаго рабіць у Лесбеле, быццам Лесбел перабудаваў ужо сваю работу адпаведна задачам рэканструкцыйнага пэрыяду... А ў сапраўднасьці, на жаль, гэта ня так.

На адным з пасяджэньняў Менскай гарадзкой кантрольнай камісіі высьветлена, што ў рабоце Лесбелу ёсьць прарывы, справы ў апараце пастаўлены дрэнна.

Для шэфаў засталося якраз шмат работы для таго, каб дабіцца ў апараце Лесбелу сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў выкананьня дырэктыў партыі і ўраду.

У верасьні мінулага году рабочыя брыгады, пад кіраўніцтвам члена ЦКК УсеКП(б) т. Штрауха, правялі абсьледваньне заводаў **«Бальшавік», «Камунар», «Энэргія»** і высьветлілі, што шэфствам там ніхто ня цікавіўся, пытаньне аб ім ня ставілася на сходах рабочых, работа ішла самацёкам.

На нарадзе, якая адбылася 24 верасьня пры ЦКК, быў дан рад практычных паказаньняў для ажыцьцяўленьня шэфскай работы, ажыцьцяўленьня рабочага кантролю і праверкі выкананьня дырэктыў партыі і ўраду савецкімі ўстановамі. Зараз менская гарКК прытуліла да праверкі выкананьня дырэктыў па шэфстве. У аб'екты агляду, апрача іншых, уваходзяць таксама тры намінёныя заводы. Праверка праходзіць пад непасрэдным кіраўніцтвам членаў гарКК, якія на мясцох стваральуць брыгады з «лёгкіх кавалерыстаў», рабкораў, ударнікаў, дэлегатак і г. д. Работа брыгад праводзіцца ў цеснай сувязі з партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі.

Вынікі праверкі брыгад трэба шырока абгаварыць на рабочых сходах. Ход праверкі павінен асьвятляцца ў друку.

На прэзыдыуме гарКК неўзабаве будуць заслухоўвацца справаздачы рабочых шэфаў з судакладамі абсьледваньнікаў а ўдзелам падшэфных устаноў.

Праверка работы шэфкіх арганізацый і гарадзкая нарада па гэтым пытаньні павінны разьбіць назаўсёды апартуністычную недаацэнку значэньня рабочага кантролю.

Непасрэднае кіраўніцтва рабочым кантролем над дзяржапаратам застаецца за кантрольнай камісіяй, перад якою стаіць пялікая задача на наладжаньні рабочага шэфства. Кантрольная камісія трэба зьвязацца з шэфскімі брыгадамі, устанавіць штодзённае кіраўніцтва імі, сыстэматычны кантроль і праверку выкананьня партыйнымі, прафсаюзнымі арганізацыямі і падшэфнымі установамі дырэктыў партыі па шэфстве.

Трэба, каб партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі пасталіна сачылі за ходам работы па шэфстве, заслухоўвалі справаздачы брыгад аб іх рабоце на сваіх пасяджэньнях і сходах.

Час мабілізаваць вакол рабочага шэфства ўсю пралетарскую грамадзкасьць. Надалей нельга цярпець нядбайных адносін да рабочага кантролю. Трэба, як належыць, ударыць па сьпячцы, што агарнула некаторыя арганізацыі.

Дабіўшыся непараўнана большай увагі да рабочага шэфства над дзяржапаратам, мы ажыцьцёвім важнейшую дырэктыву XVI зьезду УсеКП(б).

Вішнеўская.

Выкананьне фінпляну трэцяга рашаючага—

праверка баяздольнасьці партыйных і савецкіх органаў

МАБІЛІЗАЦЫЮ СРОДКАЎ—НА САПРАЎДЫ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

ЛІКВІДАВАЦЬ СТУДЗЕНЬСКІ ПРАРЫЎ,

ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ЛЮТАЎСКІЯ ПЛЯНЫ

Надзвычайная камісія ЦК КП(б)Б і СНК БССР па мабілізацыі сродкаў заслухала даклады КОПЫСКАГА БАГУШЭЎСКАГА, КРУПСКАГА, БУДА-КАШАЛЕЎСКАГА, СЕНЬНЕНСКАГА, КРУГЛЯНСКАГА і АСЬВЕЙСКАГА раёнаў аб ходзе мабілізацыі сродкаў. Камісія канстатавала ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ ВЫКАНАНЬНЕ Ў ГЭТЫХ РАЁНАХ ФІНПЛЯНУ АСОБНАГА КВАРТАЛУ І ПОЎНЫ ЗРЫЎ СТУДЗЕНЬСКАГА ЗАДАНЬНЯ (20-25 проц.).

Ганебны зрыў кампаніі зьяўляецца вынікам апартуністычнай недаацэнкі палітычна-гаспадарчай важнасьці фінпляну ў сыстэме народнай гаспадаркі. Раённыя арганізацыі замест сыстэматычнай работы па мабілізацыі сродкаў сядзяць, склаўшы рукі, і спадзяюцца на самацёк. Кіраўнікі БУДА-КАШАЛЕЎСКАГА раёну знайшлі магчымым у гэты адказны момант... пайсьці ў водпуск, прычым адпачывае адначасова амаль усё кіраўніцтва: сакратар і загадчык аддзелам райкому КП(б)Б, старшыня райвыканкому, старшыня раённай кантрольнай камісіі КП(б)Б, начальнік міліцыі і інш.

Сакратар БАГУШЭЎСКАГА райкому КП(б)Б і старшыня райвыканкому ня прыехалі на пасяджэньне камісіі, ня гледзячы на спэцыяльную тэлеграму старшыні ЦКК КП(б)Б—тав. Калініна.

У КОПЫСКІМ раёне ўсе адказныя работнікі райфа былі перакінуты райкомам КП(б)Б на іншую работу. Гэта ў значнай меры спрыяла прарыву ў студзеньскім пляне мабілізацыі сродкаў.

Кіраўнікі СЕНЬНЕНСКАГА раёну прызналі «здавальняючым» выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў за асобны квартал у той час, як гэты плян быў выкананы усяго на 70 проц. Гэта няправільная арыентацыя раённых арганізацый перашкаджала мабілізацыі сіл на поўнае выкананьне пляну.

Загадчык райфа АСЬВЕЙСКАГА раёну быў камандыраван райвыканкомам у Ленінград, дзе прасядзеў больш за месяц. У выніку адсутнасьці кіраўніцтва райфа фінплян як асобнага кварталу, так і за студзень па Асьвейскім раёне сарваны.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ КАМІСІЯ АБВЯСЬЦІЛА БЮРО РК КП(б)Б І ПРЭЗЫДЫУМАМ РАЙВЫКАНКОМАЎ КРУГЛЯНСКАГА, БАГУШЭЎСКАГА, КРУПСКАГА, КОПЫСКАГА, БУДА-КАШАЛЕЎСКАГА РАЁНАЎ, БЮРО РК КП(б)Б І БЫЛОМУ СКЛАДУ ПРЭЗЫДЫУМУ РАЙВЫКАНКОМУ СЕНЬНЕНСКАГА РАЁНУ—ВЫМОВУ ЗА ЗРЫЎ ВЫКАНАНЬНЯ ФІНПЛЯНУ ЗА СТУДЗЕНЬ, НЕРАЗГОРТВАНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ РАБОТЫ І НЕВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ЦК КП(б)Б І СНК БССР. Камісія абавязала райкомы КП(б)Б і райвыканкомы неадкладна разгарнуць баявую работу па выкананьні лютаўскага пляну, мабілізаваць вакол гэтага партыйныя арганізацыі і ўвесь актыў раёну. ДА 20 ЛЮТАГА ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛІКВІДАВАНЫ ПРАРЫЎ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЯНУ І ЗАБЯСЬПЕЧАНА ВЫКАНАНЬНЕ ЛЮТАЎСКАГА ЗАДАНЬНЯ.

Асаблівая ўвага павінна быць аддана распаўсюджаньню пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» і абавязацельстваў Трактарацэнтру, уцягненьню ўкладаў у ашчадкасы і поўнаму і неадкладнаму спагнаньню запазычанасьці з кулакоў. Адначасова неабходна мабілізаваць працоўную частку вёсні—беднату, калгаснікаў, сераднякоў на датэрміновае ўнясэньне плацяжоў па аднаразовым зборы.

ТАМ, ДЗЕ НЯМА бальшавіцкіх тэмпаў

Пляны мабілізацыі сродкаў у **Полацкім** раёне—пад пагрозай. За студзень па раёне не рэалізавана ні на адну капейку акцый Трактарацэнтру. Ня меншы прарыў і ў пазыкапляценьні. Замест 20 тыс. руб., вызначаных плянам, паступіла паёў толькі на 4.012 руб., або 20 проц. Ашчадкасы выканалі студзеньскае заданьне на 38,6 проц.

Сельсаветы і камсады сыстэматычную работу падмяняюць праваапартуністычнай стаўкай па самацёк. Рад сельсаветаў палец аб палец ня стукнулі для распаўсюджаньня пазыкі. Больш таго, некаторыя сельсаветы зусім адмаўляюцца ад гэтай работы (**Высачанскі, Юраўскі, Сястронскі, Громаўскі, Сосьніцкі**). Назіраюцца факты разбазарваньня пазыкі з санкцыі сельсаветаў і камсадаў (**Зкімаўскі, Шацілкаўскі сельсаветы**).

Калгасны сэктар вельмі слаба ахоплен пазыкай: з 58 калгасаў раёну пазыкай ахоплены толькі 26, дый у тых ня ўсе калгаснікі. Зусім дрэнная справа з узносамі па падпісцы. Калгасы, напрыклад, упесьлі 5.690 руб. замест належаных 19.480 руб. **Калгасы «Савецкая Беларусь» і «Чырвоныя паляны» ня ўнесьлі яшчэ ніводнай капейкі.**

Выкананьне і перавыкананьне вызначаных плянаў жыльлёвай каапэрацыяй (113 проц.) і дзяржстрахам (101 проц.) паказвае, чаго можна дабіцца пры сапраўды бальшавіцкіх тэмпах работы. Толькі бязьдзейнасьць, праваапартуністычная практыка работнікаў райарганізацый прывяла да ганебных прарываў у выкананьні фінпляну.

Клімавіцкі.

Брагінскіх апартуністаў—да адказнасьці

БРАГІНА. (Наш кар.). Плян мабілізацыі сродкаў па Брагінскім раёне за асобны квартал выкананы толькі на 50 проц. У бягучым квартале тэмпы яшчэ больш зьнізіліся. Студзеньскі плян, напрыклад, выкананы на... 12 проц.

Раённыя арганізацыі недаацэньваюць палітычна-гаспадарчага значэньня кампаніі. ДА АПОШНЯГА ЧАСУ РАЙФА ПРАЦАВАЎ БЯЗ ПЛЯНУ, МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ ІШЛА САМАЦЁКАМ. Прэзыдыум райвыканкому зусім не займаўся гэтым пытаньнем.

Апартуністычная бязьдзейнасьць кіраўніцтва ашчадкасамі прывяла да вялікага прарыву на фронце ўцягненьня ўкладаньняў у апошнія. ЗА СТУДЗЕНЬ замест прыліву ў 14 тыс. рублёў ЁСЬЦЬ АДЛІЎ ФІЗЫЧНЫХ УКЛАДАНЬНЯЎ НА 7 ТЫС. РУБЛЁЎ.

Па лініі каапэрацыі таксама нічога ня робіцца. Раён. спаж. таварыства выканала плян плянакапленьня на 26 проц., а па матэвых укладаньнях—на 2 проц.

ДЗЯРЖБАНК ПЕРАДАЎ СПРАВУ АБ АПАРТУНІСТЫЧНАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ БРАГІНСКІХ РАБОТНІКАЎ ПРАКУРАТУРЫ. Вінаватыя ў зрыве фінпляну павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

П. К.

Закіданы... шапкамі

Аддзел забесьпячэньня Белкаапсаюзу ня ўлічвае патрабаваньняў асобных раёнаў у таварах і адгружае апошнія без адпаведных заявак. У выніку такога «забесьпячэньня» ў адных раёнах стварэцца затаварваньне, у іншых — недахват тавараў. Падамо некалькі прыкладаў.

Гомельскае і Камарынскае райспажыўтаварыствы закіданы летнімі шапкамі. Мазырскі ЦРК загружан малінавым чаем, цыкорыем і шпалерамі. У Брагінскім раёне ёсьць вялікія залежы партфэлю і гумовых ботаў. У Капаткевіцкім спаж. таварыстве ляжыць туталіну на 10 тыс. рублёў, калёсная мазі на 4 тыс. руб., аніліновай фарбы на 3 тыс. рублёў, іншых фарбаў — па 6 тысяч рублёў, блёк-нотаў на 3 тыс. руб. і інш. Гэтыя тавары на працягу доўгага часу не рэалізуюцца. Рад спаж. таварыстваў (Хойніцкае, Рэчыцкі ЦРК і інш.) скарджацца на няправільнае і нерэгулярнае забесьпячэньне іх прадуктамі і тавараміі.

Гэта становішча стварае затрыманьне ў рэалізацыі тавараў, павялічвае запазычанасьць спажывецкай сыстэмы і адмоўна адбіваецца на выкананьні пляну плянакапленьня. Апошні па сыстэме БКС у студзені выкананы толькі на 42,2 проц.

Трэба неадкладна перабудаваць работу аддзелу забесьпячэньня Белкаапсаюзу, паклясьці канец галавацяпству ў разьмеркаваньні прадуктаў і прамтавараў сярод спаж. таварыстваў і ЦРК.

КРУЦЯЛЁЎ.

КОНКУРС-СПАБОРНІЦТВА

НА ЛЕПШУЮ ПАСТАНОЎКУ РАБОТЫ НІЗАВЫХ КАМІСІЙ САДЗЕЙНАСЬЦІ

Пастанова цэнтральнай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры ЦВК БССР

1. У мэтах актывізацыі працы камісій садзейнасьці па мабілізацыі грашовых сродкаў насельніцтва па лініі дзяржпазык і ашчадкас і большага ўзмацненьня працы ўсёй сыстэмы камісій садзейнасьці па правядзеньні баявых задач рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады», уцягненьня ў ашчадкасы ўкладаў і ўкладчыкаў—абвясьціць конкурс-спаборніцтва на лепшую камісію садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе.

2. У конкурсе прымаюць удзел усе камісіі садзейнасьці пры сельсаветах, калгасах, калектывах, прадпрыемствах і ўстановах, а таксама пры гарсаветах і райвыканкомах.

3. Паказальнікамі лепшай работы камісій садзейнасьці зьяўляецца наступнае:

ДЛЯ КАМІСІЙ ПРЫ РАЙВЫКАНКОМАХ І ГАРСАВЕТАХ.

а) Найбольшы процант перавыкананьня кантрольных лічбаў па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка» і ўцягненьні ўкладаў і ўкладчыкаў у ашчадкасы.

б) Найбольшы ахоп падпіскай на пазыку працоўных, уключаючы новапрыбыўшыя кадры рабочых і сэзонпікаў;

в) Якасныя паказальнікі агітмасавай працы на дзяржкрэдыце і ашчадсправе, і кіраваньне нізавымі камісіямі, садзейнасьці.

г) Папулярызацыя і правядзеньне бязнаяўных разьлікаў;

д) Разгортваньне нізавой сеткі ашчадкас.

ДЛЯ КАМІСІЙ ПРЫ ПРАДПРЫЕМСТВАХ І ЎСТАНОВАХ.

а) 100 проц. ахоп пазыкай усіх працоўных (рабочых і служачых) з улікам новапрыбыўшых з падпіскай на 2-хтыднёвы заработак;

б) Удзяненьне ўсіх рабочых і служачых ва ўкладчыкі ашчадкас;

в) Выкананьне кантрольнай лічбы па ашчадсправе;

г) Добрая пастаноўка агітмасавай работы на дзяржкрэдыце і ашчадсправе, дапамога падшэфнаму сельсавету, альбо калгасу ў рэалізацыі пазыкі і ўкладраненьні ашчаднай справы, сваячасовыя ўзносы на пазыцы;

д) Добрая пастаноўка грамадзкага кантролю, сваячасовае і поўнае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў па абмене аблігацый і даведкамі аб выйгрышах.

ДЛЯ КАМІСІЙ ПРЫ СЕЛЬСАВЕТАХ

а) Найбольшы процант выкананьня кантрольных лічбаў па рэалізацыі пазыкі і па ўкладах у ашчадкасы;

б) 100 проц. паступленьне тропай у лік падпіскі на пазыку ад аднаасобнікаў і аграмаддзянага сэктару;

в) Добрая пастаноўка агітмасавай работы на дзяржкрэдыце і ашчадсправе, а таксама работы па абмене аблігацый ранейшых пазык і абслугоўваньні сялян даведкамі аб выйгрышах.

ДЛЯ КАМІСІЙ ПРЫ КАЛГАСАХ.

а) 100 проц. ахоп калгаснікаў падпіскай на пазыку ў разьмеры ня менш 15 працадзён;

б) Якасныя паказальнікі работы па ўцягненьні бяднацка-серадняцкіх мас некалгаснікаў у падпіску на пазыку.

4. Для прэміяваньня лепшых камісій садзейнасьці ўстанаўліваюцца прэміі, якія ідуць на культурна-бытавыя патрэбы камісій садзейнасьці.

1) Граматы Цэнтральнай камісіі—5.

2) Экскурсіі на 1-шы тыраж пазыкі «Пяцігодка» — 5.

3) Грашовыя прэміі: адна ў 1.500 руб., 2—па 1.000 руб. 5—па 500 руб. 10—па 250 руб. Усяго 28 прэмій на 8.500 руб.

5. Для кіраваньня конкурсам і прызначэньня прэмій лепшым камісіям вылучыць журы з прадстаўнікоў ЦСПСВ

МАГУТНАЙ КАЛГАСНАЙ ХВАЛЯЙ

СПАТКАЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ

30 ПРОЦ. БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК БССР, АБ'ЯДНАНЫХ У КАЛГАСЫ, ПАВІННЫ АРГАНІЗАВАНА УСТУПІЦЬ У ДРУГУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ

Рашуча змагацца супроць права-апартуністычных спроб адарваць барацьбу за новага калгасьніка ад іншых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы сяўбы

Замест бальшавіцкіх тэмпаў-- апартуністычная стаўка на самацёк

У рабоце Лупалаўскай партарганізацыі няма асноўнага-- праверкі фактычнага выкананьня дырэктыў

70-75 проц. зямель **ЛУПАЛАЎСКАГА** раёну былі арганізаваны ў хутары. Гэтаму значна дапамог Прышчэпаў. У Лупалаўшчыне ён пасьпеў насадзіць каля 25 проц. усяго ліку хутароў. Такая спадчына засталася тут ад стельмашчыны і прышчэпаўшчыны.

Грунтуючыся на тым, што раён пераважна хутарскі, пасобныя адказныя работнікі імкнуцца гэтым апраўдаць поўную адсутнасьць работы па арганізацыі прыліву, прыкрыць апартуністычныя адносіны раённых арганізацый да асноўнай задачы — да калектывізацыі. У часе «галавакружэньня ад посьпехаў» Лупалаўшчына дайшла да 60 і больш процантаў калектывізацыі. Пасьля раён скаціўся да 7,5 проц. Аднак, дырэктывы партыі аб разгортваньні ўпартай масавай работы на правяденьні далейшай калектывізацыі на аснове ленінскіх прынцыпаў добраахвотніцтва, по паслужылі для Лупалаўскага раёну выточным пунктам арганізацыі новага магутнага прыліву.

Прайшла першая бальшавіцкая вясна. Прайшло лета. Бязьдзейнасьць і самацёк прывялі да таго, што за ўвесь гэты час прыліў у калгасы склаў усяго 3,5 проц.

А калі скончылася ўборка, у Лупалаўшчыне фактычна скончылася і «кампанія» па калектывізацыі. Даволі адзначыць, што з кастрычніка па люты, за 5 месяцаў прыліў у калгасы склаў... 0,85 проц. На 1 лютага раён калектывізаваны на 11,86 проц.

За сьнежань па хутарскіх раёнах БССР прырост складаў 1,4 проц., а па Лупалаўскім — толькі 0,2 проц. Лупалаўшчына ішла ў галіне калектывізацыі ў сем раз меншымі тэмпамі, чым іншыя хутарскія раёны рэспублікі.

Толькі ў апошнія 2-3 тыдні, у сувязі з перамывамі сельсаветаў, райзьездам і «ленінскім днём» арганізавана 6 новых калгасаў з цязначнай колькасьцю двароў. У гэтыя-ж дні былі створаны 3 ініцыятыўныя групы.

Асноўная прычынай недапушчальнага адставаньня раёну ў арганізацыі калгаснага прыліву зьяўляюцца апартуністычныя адносіны да пытаньняў калектывізацыі з боку Лупалаўскага райкому КП(б)Б і раду нізавых арганізацый. Значная частка партыйных ячэек раёну (Махаўская, Амхоўская, Сухараўская, Чарнаўская і інш.) не перабудавалі сваёй работы, не павярнуліся тварам да калектывізацыі.

Сістэматычная работа з батрацтвам і беднатой — гэта асноўная ўмова пасьпяховага разгортваньня калектывізацыі мае — была ўвесь час у заняпадзе. З 61 калгасу раёну толькі пры 11-ці (тыя то ў апошнія дні) арганізаваны групы беднаты. Пры сельсаветах групы беднаты толькі зараз распачынаюць працаваць.

Кулак, які ваўдзе тут актыўную антыкалгасную агітацыю і імкнецца разбурыць калгасы ня сустрэў належнага адпору. Масы калгасьнікаў і адназасобнікаў — беднякоў і сераднякоў — ня былі ў належнай меры мабілізаваны на барацьбу з кулаком.

Зьнішчэньне і разбазарваньне коняй, якое назіралася ў раёне, — таксама вынік кулацкай агітацыі. Клясавы вораг распускаў чуткі сярод калгасьнікаў, што коні калгасам ужо непатрэбны, бо будзе дастаўлена патрэбная колькасьць трактараў. Простую паслугу кулаку аказалі анархісты, якія недаацэньваюць значэньня жывой цягавай сілы ў бягучую вясну. Так, праўленьне калгасу «Камінтэрн» прадало на забой 39 коняй, матывуючы гэта тым, што яны старыя. Сярод разбазараных коняй было шмат такіх, якія маглі працаваць яшчэ па некалькі год. У большасьці калгасаў раёну ня ведаюць аб дырэктыве Калгасцэнтру наконт падрыхтоўкі каня да вясны. Трэба сказаць, што да гэтай важнейшай справы тут яшчэ не прыступілі. З-за безгаспадарчасьці на многіх калгасах ня хопіць кармоў («Чырвоная зара», «Колас», «Парыская камуна»).

Кулацкай агітацыі за разбазарваньне і зьнішчэньне коняй раённыя арганізацыі проціставілі... вымовы і папярэджаньні. Вось увесь арсенал мер адміністрацыйнай узьдзейнасьці. Ня было самага важнага — шырокага выкрыцьця ў вачох масы калгасьнікаў і адназасобнікаў сутнасьці кулацкага манэўру, мабілізацыі калгасьнікаў на сапраўдную падрыхтоўку каня да вясны.

У значнай частцы калгасаў яшчэ да гэтага часу не падагулены вынікі першага калгаснага году і не разьмеркаваны прыбыткі.

Райкалгасаюз тлумачыць гэта аб'ектыўнымі прычынамі — ня было рахункаводаў. Між тым, калі-б правільна разьмеркавать наяўныя разэравы рахункоўных работнікаў, дык яшчэ да зімы можна было-б у асноўным скончыць разьмеркаваньне ўрадажаю. Знайшліся-ж цяпер рахунковыя работнікі, якія брыгадамі паехалі ў калгасы.

У жніўні мінулага году за праваапартуністычную практыку было зьнята з работы кіраўніцтва райкалгасаюзу. Райком, на жаль, толькі гэтым і абмежваўся. Райкалгасаюз ня быў забясьпечан работнікамі, яго апарат застаўся неўкамплектаваным патрэбнымі кадрамі.

Работнікі раённых устаноў і асабліва адказныя выяжджаюць, пераважна, у тыя месцы, дзе ёсьць моцныя партыйныя і камсамольскія ячэйкі ці калгас. Заходкі, Мастоцкі і Машынацкі сельсаветы выкінуты з маршруту раённых работнікаў. Гэта ядрал тых сельсаветы, якія цягнуцца ў хвасьце. Тут і самы слабы рост калектывізацыі, і больш за ўсё кульцае масавая работа.

Цягатка кадзінага «благодушия» часам прыкрывае факты ганебнейшай безгаспадарчасьці. На 50 проц. дыя больш яшчэ не абмалочана збожжа ў калгасах раёну. Гэта азначае, што 50 проц. пасеяных фондаў ня могуць быць засыпаны. Асабліва дрэнна з абмалотам у калгасах «Чырвоны фронт», «Новае жыцьцё», імя Чарвякова.

Райкому партыі, РВК і райкалгасаюзу была, безумоўна, вядома галерэя агіднейшых базгаспадарчых спраў у радзе калгасаў. Але-ж пакуль у справу «Парыскай камуны», «Новага жыцьця» і іншых калгасаў не ўмяшалася РСІ, раённыя арганізацыі заставаліся ў ролі пасыўных назіральнікаў.

Яшчэ 16 сьнежня бюро райкому вызначыла плян веснавой кампаніі і дало аднаведныя дырэктывы. З таго часу прайшло ўжо каля 2-х месяцаў, а сыстэматычная праверкі выкананьня даных дырэктыў фактычна ня было.

Раён бярэ садова-гародны напрамак. Тэмп падрыхтоўкі да вясны не забясьпечвае хуткай спэцыялізацыі раёну і ажыцьцяўленьня пляну. Раён адчувае патрэбу ў значнай колькасьці гароднага насеньня, аднак, райкалгасаюз і іншыя арганізацыі ня ўжываюць належных мер да мабілізацыі насенных рэсурсаў раёну. Рамонт сэльска-гаспадарчага інвэнтару не распачаты. Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў жалеза засталася на паперы.

У раёне ёсьць рад калгасаў, якія паказваюць узор бальшавіцкай работы і правільнага вядзеньня гаспадаркі. Аднак, тыя вялізарныя прарывы, якія мы адзначалі, тармозяць далейшае разгортваньне калектывізацыі і падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны. Адзначаныя прарывы, адсутнасьць работы па замацаваньні існуючых калгасаў, бязьдзейнасьць і самацёк у справе далейшай калектывізацыі—усё гэта вынік праваапартуністычнай практыкі раду раённых і нізавых арганізацый, вынік таго, што ў Лупалаўшчыне масы ня былі належным чынам мабілізаваны на барацьбу з кулаком.

Кіраўніцтва з боку райкому партыі ажыцьцяўлялася фармальна, бо ня было сыстэматычнага кантролю над выкананьнем дырэктыў, якія выносіліся райкомам.

Брыгада лічыць, што асноўная ўмова пасьпяховай ліквідацыі прарываў і пераходу на баявую падрыхтоўку да веснавой сяўбы—гэта выкарчоўваньне праваапартуністычнай практыкі работы—самацёку, ігнараваньня масавай работы—мабілізацыяй мас на барацьбу з кулацтвам. Толькі пры выкананьні гэтай умовы Лупалаўшчына даб'ецца магутнага масавага прыліву ў калгасы, сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны. Асабходна павесьці рашучае бязьлітаснае наступленьне на кулака, рашучую барацьбу з правымі і «левымі» апартуністамі, выганяючы іх з партыі і ўстаноў. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на ўмацаваньне райкалгасаюзу.

Трэба зараз-жа мабілізаваць партыйную і камсамольскую арганізацыю, раённы актыў, шырокія масы калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў—адназасобнікаў на перамаганьне тормазаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі Лупалаўскага раёну, разгортваючы ўсю работу па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Брыгада «Зьвязды»:
Мазэпін—сьлесар торфазаводу.
Нікіценка—Лупалаўская РайКК-РСІ
Ал. Ліпнёвы—рэд. «Зьвязды».

Новыя калгасы-- на адозву партыі і ўраду

ГЛУСК. (Па тэлефону). У вёсцы **Матовічы** 9 лютага **арганізаваўся калгас** у складзе 40 бядняцка-серадняцкіх двароў. Калгас названы імем тав. Варашылава.

У вёсках Новае і Старое Базірава арганізован калгас з 16-ці двароў—«Шлях да сацыялізму».

Аб'ядналіся ў калгас 20 бядняцка-серадняцкіх двароў в. Сімановічы. Калгас названы імем тав. Будзённага.

Беднякі і сераднякі адказваюць на адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі аб'яднаньнем у калгасы. За апошнія часы ў раёне арганізавана 11 калгасаў, адзін з іх—нацыянальны польскі.

У сувязі з пашырэньнем калгаснага прыліву актывізавалася дзейнасьць кулацтва, якое тэрорам прабуе запалохаць масы калгасьнікаў і адназасобнікаў. Так, у часе перавыбараў праўленьня калгасу ў вёсцы **Лясковічы** кулакамі была падпалена мамасьць калгасу і сельсавету.

На шкодніцкую дзейнасьць кулацтва калгасьнікі адказваюць узмацненьнем падрыхтоўкі да сяўбы, арганізацыяй новага прыліву.

Брыгада «Зьвязды»—АДЗІНЕЦ.

Да 15 лютага

СКОНЧЫЦЬ АДВОД ЗЯМЕЛЬНАЙ ПЛОШЧЫ ПАД САУГАСЫ „СЬВІНАВОДА"

У будаўніцтве новых саўгасаў перад трэстам «Сьвінавод» пастаўлены адказьнейшыя, сапраўды грандыёзныя задачы.

На тэрыторыі каля 20 тыс. гэкт. пахаці, якая была адведзена Сьвінаводу пры яго арганізацыі, можна было разьмясьціць толькі 20 тыс. сьвіняматак.

Праграма будаўніцтва буйных спэцыялізаваных сьвінагадоўчых гаспадарак, выначаная КП(б)Б і ўрадам БССР, надзвычай вялікая.

Ужо ў 1931-32 годзе гаспадаркі Сьвінавода павінны пастаўіць 75 тыс. сьвіняматак, для чаго патрэбна пры нармальным развароце стада ня менш 100 тыс. гэкт. пахаці.

Пасьпяховае выкананьне гэтай бальшавіцкай праграмы па сьвінагадоўлі ставіць пытаньне аб найшпарчэйшым пашырэньні зямельнай плошчы ў існуючых гаспадарках, аб арганізацыі новых спэцыялізаваных сьвінагадоўчых саўгасаў.

Палітычная важнасьць гэтай адказнай і тэрміновай работы відавочная. Ня бачаць гэтага **толькі зямельныя органы, якія, ня гледзячы на ўрадавыя пастановы і пастановы партыі, ня выконваюць ускладзенай на іх работы.**

У ліпені 1930 году ЭКАНА БССР прапанавала Наркамзему да кастрычніка месяца 1930 году адвесьці для саўгасаў Сьвінавода 60 тыс. гэкт. прыгодных зямель.

Наркамзем ня выканаў свайго абавязку і замест 60 тыс. гэкт. адаў усяго 20 тыс. гэкт.

Маючы 40 тыс. гэкт. пахаці, ні ў якім разе нельга паставіць 75 тыс. сьвіняматак, бо апошніх не забясьпечыць кармамі, якія зьяўляюцца неабходнейшай умовай для пасьпяховай і нармальнай гадоўлі сьвінога стада.

ЦК КП(б)Б прапанаваў у тэрміновым парадку не пазьней 15 лютага скончыць адвод зямельнай плошчы саўгасам Сьвінавода.

Новыя масывы дадуць магчымасьць значна павялічыць праграму будаўніцтва сьвінагадоўчых гаспадарак, перавысіць плянавыя меркаваньні і дабіцца большых рэальных вынікаў.

Для будаўніцтва новых саўгасаў і пашырэньня старых урадам адпушчана 10 млн. рублёў. Зараз неабходна стварыць усе магчымасьці для таго, каб балывымі тэмпамі выканаць намечаную праграму будаўніцтва спэцыялізаваных сьвінагадоўчых гаспадарак.

Студзеньскі пленум па пытаньні аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі а асабліва рэкасьцю зазначыў на вядучую ролю саўгасаў у перабудове сельскай гаспадаркі на новы лад. Пленум абавязаў Наркамзем, саўгасныя трасты і ўсе раённыя партыйныя, камсамольскія і інш. арганізацыі каронным чынам паленьніць кіраўніцтва старымі саўгасамі і асабліва зьвярнуць увагу на будаўніцтва новых саўгасаў.

Сьвінаводу патрэбна правесьці вялікую работу, каб забясьпечыць будаўніцтва новых саўгасаў рабочай сілай, кадрамі, будаўнічым матар'ялам.

Белсельбуд, леспрамгасы сапраўды па-баявому павінны разгарнуць вывазку будаўнічых матар'ялаў, якія прызначаны для саўгасаў Сьвінавода. Вакол будаўніцтва новых саўгасаў і пашырэньня існуючых партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя, савецкія і інш. арганізацыі павінны мабілізаваць усе сілы, усе масы калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкай часткі вёскі.

Плян будаўніцтва мясных фабрык павінен быць выканан у тэрмін.

Аўчыньнікаў.

Тварам да вытворчасьці!

ПАРТ'ЯЧЭЙКІ І РАБАЧКОМЫ АДКАЗВАЮЦЬ ЗА ПАДРЫХТОЎКУ САУГАСАЎ ДА СЯЎБЫ

Будаўніцтва малочных жывёлагадоўчых гаспадарак, пераўтварэньне іх у буйныя фабрыкі мяса і малака, шляхам спэцыялізацыі — вось важнейшая задача, пастаўленая апошнім зьездам партыі. Ва ўмовах БССР будаўніцтва малочна-жывёлагадоўчых і сьвінаводчых гаспадарак мае выключнае палітычнае і эканамічнае значэньне.

У гэтай галіне мы ўжо маем рад значных дасягненьняў. Калі ў 1929 годзе малочна - жывёлагадоўчыя гаспадаркі займалі 19.000 гэкт. і мелі 7.000 галоў буйной рагатай жывёлы і маладняка, **маюць плошчу ў 27.000 гэкт. і маюць 24.000 буйной рагатай жывёлы і маладняка. У надыходзячую веснавую сяўбу на палёх саўгасу будзе працаваць звыш 300 трактараў.**

Гэтыя посьпехі даюць лепшы адказ усім правым і «левым» апартуністам і поўнасьцю пацьвярджаюць правільнасьць генэральнай лініі партыі ў справе сацыяльна-эканамічнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў вырашэньні мясной праблемы. Але было-б зусім неправільным, калі-б на фоне гэтых посьпехаў мы не заўважылі недахопаў у рабоце раду саўгасаў БССР.

Па-першае, трэба падкрэсьліць, **што падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў бальшасьці саўгасаў разгортваецца вельмі марудна. Партыйныя ячэйкі і рабачкомы яшчэ не мабілізавалі калектывы саўгасных гаспадарак на выкананьне задач другой бальшавіцкай вясны, не перабудавалі і сваёй работы.**

Паводле вестак на 30 студзеня, **па саўгасах Белсаўгастрасту адрамандавана 44 проц. сельгасінвэнтару і 30 проц. трактараў.** Адсартавана **1.734 тоны насеньня, або 7 проц. патрэбнасьці, у тым ліку адсартавана 368 тон насеньня капгасаў. Угнаеньня завезена толькі 23% патрэбнай колькасьці, вапны — 9 проц. Зусім дрэнна ідзе збор попелу,** дагэтуль загатоўлена 238 тон, што складае 17 проц. заданьня. Вельмі марудна ідзе і завоз с.-г. інвэнтару. З 114 конных плугоў завезена толькі 16, а 107 трактараў і трактарных плугоў не завезена ні аднаго.

Ня лепш справа з падрыхтоўкай да сяўбы і **У САЎГАСАХ НАСЕНАВОДНАГА ТРЭСТУ.** Паводле плану трэба ачысьціць 2.900 тон насеньня, ачышчана-ж 554 тоны — 19 проц. З 28 трактараў адрамантавана толькі 11.

Зусім дрэнна ідзе падрыхтоўка да сяўбы ў саўгасах Сьвінаводтрэсту, які наогул ня ведае аб становішчы гэтай справы. Як правіла, саўгасы не дасылаюць надзвычайных вестак, тыя-ж, што выпадкова прысылаюцца, паказваюць вельмі адмоўны малюнак. Так, саўгас «Новыя Зеленкі» павінен адрамантаваць 30 плугоў і 32 калёс, **дагэтуль нічога не адрамантавана.** Кіраўнік саўгасу Лупаўшчына ўвесь час уводзіў у аман дырэкцыю трэсту, паказваючы, што рамонт ідзе добра. Зараз-жа выявілася, што фактычна нічога ня зроблена. Трэба адрамантаваць 40 плугоў, 40 бран.

Пашырэньне пасеўнай плошчы на саўгасах Белсаўгастрасту патрабуе дадатковай рабочай сілы. Але вярбоўка прынята толькі 260 чал., што складае 6 проц., вызначанае колькасьці плянам. У 1930 годзе ў саўгасы ўлілося звыш 6.000 новых рабочых, выключна батракоў. Сярод гэтай групы рабочых яшчэ ёсьць чыста спажывецкія і дробнабуржуазныя настроі. Для перавыхаваньня гэтых батракоў патрэбна энэргічная культурна-масавая работа. Між тым, на справе ні парт'ячэйкі, ні рабачкомы **не разгарнулі адпаведнай работы сярод гэтай часткі рабочых і вельмі мала зрабілі для ўкараненьня сярод іх навыкаў калектыўнай працы, мэтадаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва.**

Практыка работы паасобных саўгасаў паказвае, што партыйныя ячэйкі і рабачкомы гэтых саўгасаў скаціліся ў балота апартунізму. Сваёй злачынная бязьдзейнасьцю яны стваралі глебу для шкодніцкай работы.

Партыйная ячэйка і рабачком саўгасу **Вязынь-Фаніпаль** (Койданаўскі раён) зусім ня цікавіліся гаспадарчым жыцьцём саўгасу. Палітыка-выхаўчая і культурна-масавая работа не праводзілася. Бязьдзейнасьцю грамадзкіх арганізацый карыстаўся дырэктар саўгасу, які даваў Белсельтрэсту няправільныя весткі аб становішчы гаспадаркі. Практыка прывяла да таго, што на полі палегліо жыта і канюшына. Гаспадарчыя задачы вырашаліся габінэтным шляхам, без прыцягненьня рабочых.

У саўгасе **Райцы,** (Талочынскі раён), камуністы і камсамольцы не паказваюць узорных прыкладу работы, а, наадварот, плятуцца ў хвасьце. Парт'ячэйка і рабачком на гэта не рэагуюць. Рабочыя ня былі мабілізаваны на пасьпяховае выкананьне гаспадарчых плянаў. У выніку на полі засталося нескошаным 15 гэкт. сенажаці і 7 гэкт. лубіну, сарвана сіласаваньне.

Партыйныя ячэйкі раду саўгасаў не ўявілі сабе, што правы апартунізм на практыцы, нагадлівыя адносіны да саўгаснай вытворчасьці зьяўляюцца простай дапамогай кулацкай агітацыі супроць сацыялістычнай рэканструкцыі сельская гаспадаркі.

Партыйныя раённыя арганізацыі павінны зараз зьвярнуць асаблівую увагу на работу савецкіх гаспадарак, каб **яны былі апорнымі пунктамі капэктывізацыі, каб яны паказвалі перавагу капэктыўных і сацыялістычных мэтадаў працы, каб яны як былі сапраўды узорнымі гаспадаркамі для вакольных бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.**

Партыйныя ячэйкі і рабачкомы саўгасаў павінны на кожным кроку цікавіцца станам саўгаснай вытворчасьці, дапамагаць дырэктарам у выкананьні гаспадарчых задач.

Шырэйшай палітыка-выхаўчай і культурна - масавай работай парт'ячэйкі і рабачкомы павінны мабілізаваць рабочыя калектывы на выкананьне задач другой бальшавіцкай вясны, вядучы рашучую барацьбу з бесгаспадарчасьцю і ляцбайнасьцю.

На агляд пралетарскай грамадзкасьці закрытыя разьмеркавальнікі і сталовыя

УКЛЮЧАЙЦЕСЯ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС

Закрытыя разьмеркавальнікі і сталовыя павінны стаць узорнымі цэхамі рабочага забесьпячэньня

Выканаць дырэктыву студзеньскага пленуму ЦК

Конкурс на лепшы закрыты разьмеркавальнік і закрытую сталоўку

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) на дакладу спажывецкай каапэрацыі адначыў, што «спажывецкая каапэрацыя павінна перабудаваць сваю работу ў бок бязумоўнага забесьпячэньня ў першую чаргу важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва і ўвязкі справы забесьпячэньня з выкананьнем вытворчых плянаў, узьняцьцем прадукцыйнасьці працы, барацьбой з цякучасьцю рабочай сілы і заахвочваньнем сацыялістычных форм арганізацыі працы».

Для практычнага ажыцьцяўленьня гэтай пастановы прэзыдыум ЦСПСБ у сваёй пастанове ад 30 студзеня адзначыў неабходнасьць абвяшчэньня УСЕБЕЛАРУСКАГА КОНКУРСУ на лепшую работу закрытага разьмеркавальніка і сталоўкі. У часе конкурсу павінен быць праведзен агляд работы закрытых разьмеркавальнікаў і сталовак, які павінен зьвяцца паваротным пунктам у іх рабоце.

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК адзначыў важнейшае значэньне закрытых разьмеркавальнікаў, як новай арганізацыйнай формы клясавага разьмеркаваньня прадуктаў. Тым ня менш назіраецца яшчэ шмат недахопаў і скажэньняў як закрытых разьмеркавальнікаў, так і сталовак. У Гомелі і Бабруйску назіраецца нават скажэньне самой ідэі арганізацыі разьмеркавальнікаў. Там 6-7 адначо разьмеркавальніка і ў выніку... тая-ж самая чарга. Далей адсутнасьць усякай сыстэмы і пляну ў забесьпячэньні закрытых разьмеркавальнікаў з боку ЦРК (Гомель, Бабруйск, Менск). Напрыклад, па Менску забесьпячэньне абуткам на шчотачнай фабрыцы складае 10,2 р. на аднаго чалавека, а на мэталяпрацоўчым заводзе «Энэргія»—2,9 руб. Па забесьпячэньні гатовым адзеньнем—на шчотачнай фабрыцы на аднаго рабочага прыпадае 20,2 руб., а на заводзе «Энэргія»—8,5 руб.

Назіраецца шмат выпадкаў прымацаваньня да закрытых разьмеркавальнікаў па запісках фабзаўкомаў, ЦП саюзаў і г. д. Па саюзе швэйнікаў нават патрабавалася чыстка прымацаваных да закрытага разьмеркавальніка, каб выканаць асноўную дырэктыву партыі аб клясавым падыходзе.

Вельмі слаба стаіць справа з кіраўніцтвам закрытымі разьмеркавальнікамі з боку ЦРК. Напрыклад, у разьмеркавальніку дрэваапрацоўшчыкаў доўгі час ляжала капя 200 пар абутку. Яны не рэалізаваліся ў сувязі са сваёасаблівай сыстэмай выдачы талёнаў, якія давалісь толькі тым, каму належала атрымаць спэцвопратку.

Другім, ня менш важным вучасткам работы спажывецкай каапэрацыі зьяўляецца грамадзкае харчаваньне. Асабліва значэньне маюць сталоўкі закрытага тыпу на прадпрыемствах.

Праўда, у рабоце закрытых сталовак за апошні час маем рад паляпшэньняў. Мы дабіліся па радзе буйных прадпрыемстваў прамысловых гарадоў (Менск, Гомель, Віцебск) забесьпячэньня гарачымі абедамі або вячэрамі начных зьмен нароўні з дзённымі зьменамі. Мы маем вялікі зрух у бок паляпшэньня якасьці абедаў («Камунар», «Энэргія», «Бальшавік», абуткоўая фабрыка, «Пралетары»—Гомель), зьнішчана чарга («Камунар», «Энэргія»). Але ўсё-ж ёсьць шмат недахопаў, якія трэба зьнішчыць. Яшчэ назіраецца антысанітарыя, бруд, тараканы на сьценах і г. д. Санітарныя дактары зьяўляюцца рэдкімі гасьцьмі на прадпрыемствах. На некаторых фабрыках і заводах, у сувязі з адсутнасьцю рацыяналізацыі ў справе падачы абедаў, час абедаў працягваецца ня менш поўгадзіны («Энэргія»), рабочым мала часу застасьцца для культурнага адпачынку.

Да гэтага часу сталовая на прадпрыемстве не займае ў адміністрацыі такога-ж месца, як іншыя цэхі. На радзе прадпрыемстваў сталоўкі, як і раней, зьяўляюцца бяспрытульнымі. Мы яшчэ зьяўляемся сьведкамі таго, як адміністрацыя адмаўляецца адпусьціць пару дошак для рамонту кухні, або адмаўляецца дапамагчы набіць ляднік для сталоўкі («Энэргія»). Слаба ідзе заключэньне дагавораў з каапэрацыяй. У гэтым, праўда, віна больш падае на прафсаюзы, пачынаючы з ЦП і канчаючы фабзаўкомамі.

Некаторыя фабзаўкомы да сёнешняга дня яшчэ лічаць, што сталоўка гэта, праўда, цэх, але цэх «другога разраду» і што гэту работу можна ўскласьці цалкам на загадчыка сталовай, і з плеч даплоў. Фабком фабрыкі «Кастрычнік» нават не знайшоў патрэбным выслухаць таварыша, які езьдзіў у Маскву з брыгадай для азнаямленьня з пастаноўкай работы на «Электропроводе».

Такім чынам мы бачым, што ў рабоце закрытых разьмеркавальнікаў і сталовых ёсьць рад буйных недахопаў.

КОНКУРС І АГЛЯД РАБОТЫ ПАВІННЫ ЗЬЯВІЦЦА СТЫМУЛАМ ДЛЯ МАБІЛІЗАЦЫІ ШЫРОКАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ Ў ДАПАМОГУ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ Ў СПРАВЕ ПАЛЯПШЭНЬНЯ РАБОТЫ ЗАКРЫТЫХ РАЗЬМЕРКАВАЛЬНІКАЎ І СТАЛОВЫХ.

З. БЕЛЕНЬКІ.

Прэмію за лепшую работу

Пры „Зьвязьдзе" ствараецца конкурсная камісія

Прэзыдыум ЦСПСБ, з мэтай правэрки выкананьня пастаноў XVI партзьезду і сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб рабоце спажывецкай каапэрацыі, пастанавіў правесьці на працягу 15 лютага—15 сакавіка конкурс на лепшы закрыты разьмеркавальнік і закрытую сталоўку і агляд іх работы.

Агляд павінен праходзіць пры актыўным удзеле шырокіх рабочых мас і павінен выклікаць хвалю рабочай актыўнасьці ў справе паляпшэньня работы закрытых разьмеркавальнікаў і сталовых.

У часе агляду трэба дабіцца зьнішчэньня ўсіх недахопаў у рабоце закрытых разьмеркавальнікаў і сталовых, увядзеньня новых форм і мэтадаў (безпаяўныя разьлікі і папярэднія заказы на абеды, пашырэньне практыкі работы «Электропровода» і г. д.), якія шмат дзе далі дадатныя вынікі.

Асноўная задача ў часе конкурсу і агляду прыпадае на друк—як цэнтральны, так і раённы і фабрычна-заводзкі. Газэты павінны шырока асьвятляць ня толькі ход конкурсу і агляду, але стаць і арганізатарамі паказу лепшай работы, лепшых форм і мэтадаў.

Лепшыя закрытыя разьмеркавальнікі і сталоўкі, якія сапраўды перабудавалі сваю работу, атрымаюць прэміі. Таксама атрымаюць прэміі заўкомы, каапбюро, крамкамісіі і рабкоры за лепшае разгортваньне масавай работы вакол закрытых разьмеркавальнікаў і сталовых, за лепшую пастаноўку рабочага кантролю і дапамогі ў іх рабоце, за лепшую рабочую прапанову і лепшую карэспандэнцыю.

Фонд прэміяваньня вызначан у суме **30.000 руб.** Для прэміяваньня закрытых разьмеркавальнікаў вызначаны 5 прэмій на суму 13.200 руб., для прэміяваньня закрытых сталовых—5 прэмій на суму 13.500 руб., 4 прэміі па суму 800 руб. для пэрсаналу разьмеркавальнікаў, 4 прэміі ў 800 руб. для пэрсаналу сталовых, 5 прэмій у 600 руб. для заўкомаў і каапбюро, 5 прэмій у 300 руб. для членаў заўкомаў і каапбюро пэрсанальна, 7 прэмій у 500 руб. за лепшую рабочую прапанову і 7 прэмій у 300 руб. за лепшую карэспандэнцыю.

Для выначэньня каму належыць выдаць прэмію, пры «Зьвязьдзе» будзе створана камісія з прадстаўнікоў ЦСПСБ, Белкаапсаюзу, цэнтральных газэт, рабочых прадпрыемстваў, ЦП саюзу харчавікоў і саўгандальслужачых. Старшынёй камісіі назначан загадчык сацыяльна-бытавога сэктару ЦСПСБ т. **Беленькі.** Такія-ж камісіі павінны быць арганізаваны на мясцох. Пытаньне аб прысуджэньні прэмій павінна раней абмяркоўвацца на пасяджэньні мясцовай камісіі і потым на цэнтральнай конкурснай камісіі пры «Зьвязьдзе».

Усім ЦРК, гарпрафсаветам і гарадзкім аддзяленьням саюзаў харчавікоў і саўгандальслужачых паслана падрабязная праграма конкурсу і агляду, у якой вызначаны асноўныя моманты агляду і паказальнікі, да якіх павінны імкнуцца кожны закрыты разьмеркавальнік і кожная закрытая сталоўка.

Агляд работы закрытых разьмеркавальнікаў і сталовых праводзіцца камісіяй у складзе прадстаўнікоў прафсаветаў, саюзаў саўгандальслужачых і харчавікоў, мясцовага і цэнтральнага друку, рабочых адпаведных прадпрыемстваў і ЦРК пад старшынством прадстаўніка прафсавету з прыцягненьнем адпаведных спэцыялістаў: рахункоўных і санітарных работнікаў, кулінараў і г. д.

Вінаватых у зрыве загатовак малочных прадуктаў—пад суд

ЗЛАМАЦЬ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ АПАРТУНІСТАЎ

Апошні пленум ЦК КП(б)В у пастанове аб рабочым забесьпячэньні адзначыў неабходнасьць паставіць кантрактацыю малака і загатоўку малочных прадуктаў побач з важнейшымі гаспадарчымі і палітычнымі заданьнямі.

Трэба, аднак, канстатаваць, што каапэрацыі, загатоўчыя органы і мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі ня выканалі ў гэтых адносінах дырэктывы партыі. Яшчэ да гэтага часу загатоўка малака і малочных прадуктаў затрэцца адным з самых слабых вучасткаў. Адной з асноўных прычын гэтага зьяўляецца парушэньне клясавай лініі на мясцох, патураньне кулаку з боку раду загатоўчых арганізацый.

Так, па **сыстэме жывёлагадоўчай каапэрацыі плян загатоўкі малака і малочных прадуктаў за асобны квартал выкананы усяго на 15,3 проц.** Няма належнага зруху і ў студзені.

У рабоце загатоўчых органаў няма дакладнасьці. Зусім слабая ўвага аддаецца вытворчаму абслугоўваньню малочна-жывёлагадоўчых гаспадарак.

Зоатэхнікі большую частку свайго часу аддаюць на складаньне плянаў, а не на практычнае паляпшэньне вытворчага абслугоўваньня малочна-жывёлагадоўчых гаспадарак.

Па БССР лічыцца некалькі дзесяткаў малочна-таварных фэрм. Але ў большасьці іх работа не наладжана.

Кулацка-заможныя гаспадаркі ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Кіраўніцтва некаторых РВК і сельсаветаў праяўляе апартуністычныя адносіны да выкананьня кулакамі цьвёрдых заданьняў.

Ня лепш і па сыстэме спажывецкай каапэрацыі. **У большасьці РСТ, як Любаньскім, Жлобінскім, Бешанковіцкім, Лагойскім і інш. да гэтага часу заданьні нават не даведзены да кулацка-заможных гаспадарак** і зусім не разгорнута работа па кантрактацыі і загатоўцы малочных прадуктаў. Старшыня Баслаўскага РСТ **Храпоўскі** заявіў прадстаўніку Белкаапсаюзу: распачаць работу па кантрактацыі малака яшчэ часу хопіць, а калі вам трэба так хутка, дык рабеце. Я сваё месца ўступлю, а калі аддадзеце суду, дык будуць судзіць раз, а ня два». Апартуністычныя адносіны да кантрактацыі малака праявіў і райгандаль **Заслаўскага** раёну, які заявіў «кантрактацыю малака нельга весьці таму, што кароў бяруць, накідаюць толькі на адной карове». Недапушчальна марудна разгортваецца кантрактацыя малака і па **Магілеўскім** раёне.

У выніку такога «работы» ў цэнтральную мясцкую малочную паступлае ўсяго для перапрацоўкі 1.500-1.700 літраў у дзень і тое ад малочных фэрм ЦРК і часткова ад калгасаў і саўгасаў. На прыватным-жа рынку малако і малочныя прадукты ёсьць.

Трэба безадкладна скончыць давяданьне цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак і прымусіць кулакоў выканаць гэтыя заданьні.

Апартуністы тыпу Храпоўскага, якія зрываюць выкананьне дырэктывы партыі аб загатоўках малака і малочных прадуктаў, павінны быць вытрашаны з каапэрацыйнага і загатоўчага апарату.

УСАЎ, ВЕДАЮЧЫ.

Тав. СОКАЛАЎ — рабочы-вылучэнец — загадчык сталоўкі заводу «Камунар»

Слова за пракуратурай

Віцебскі ЦРК мае 17 сьвінаадкормачных пунктаў. Абсьледваньне 12 пунктаў выявіла буйнейшыя прарывы ў іх рабоце.

На радзе пунктаў сьвінарнікі пабудаваны па-шкодніцку. У саўгасе Білева пабудавалі сьвінарнікі на 600 штук без карантыну і

Праблема кадраў на ідэалёгічным фронце

Контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм імкнуўся захапіць пад свой уплыў і кіраўніцтва ўсе галіны нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Беларуская Акадэмія Навук, Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, БДУ, Горацкая Акадэмія, політэхнікумы, сямінодкі, настаўніцкія курсы, Наркамзем і г. д. і г. д. былі засьмечаны нацыянал-дэмакратамі.

Злачынная контр-рэвалюцыйная дзейнасьць нац-дэмаў сваячасова была заўважана і ёй, гэтай дзейнасьці, і носьбітамі яе нанесен руйнуючы ўдар. Цалкам выкрыт і разьвенчан агідны твар нац-дэмаў, гэтых дапаможнікаў польскага фашызму.

Працоўныя масы пераканаліся, які вялікі і агідны вораг гадаваўся на целе працоўных і хто рыхтаваў пралетарыяту ў сьпіну адвостраны нож.

Нацыянал-дэмакратызм разьбіт, але недабіты рэшткі, спадчына, якую пакінулі пасьля сабе нац-дэмы.

Злачынная і контр-рэвалюцыйная спадчына нац-дэмаў вызірае яшчэ з граматык і сынтаксаў Лёсікаў і з іншых «навуковых прац» варожых нам «акадэмікаў», ад якіх патрэбна, як ад якой нашасьці пазбавіцца, выкінуць з нашых школ і навучальных устаноў—зьнішчэньне гэтую ідэалёгічную гамтрэну. Трэба рашуча вылучыць новыя кадры, узброеныя марксыцка-ленінскім мэтадам, які адзін правільна навучае пазнаваць сьвет і жыцьцё і яго законы, навучае зьмяняць жыцьцё і сваю істоту і вядзе чалавецтва з «царства неабходнасьці ў царства свабоды».

Як ні сумна, а трэба прызнаць, што нацыянал-дэмакратычная прадукцыя мы вельмі слаба супроцьстаўляемся, вельмі мала аддаем часу і ўвагі барацьбе з ёй, і вельмі павольнымі тэмпамі даём сваю савецкую прадукцыю.

Узяць-бы падручнікі для ніжэйшых і сярэдніх школ. Што зроблена ў гэтай галіне? Вельмі мала. Да сёньня мы ня маем марксыцкай гісторыі беларускай літаратуры, ці хоць-бы нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры.

Няма беларускай навуковай граматыкі, граматыкі для школ. (Лёсікава граматыка ні ў якім разе нас задаволіць ня можа, з тае прычыны, што гэта граматыка эклектычная, «наскубаная» з розных як фармалістычных, так і «лёгічных» граматык, варожая нам сваёй мэтаімкнёнасьцю).

Але найгоршы стаіць справа з падрыхтоўкай высока-кваліфікаваных літаратурна-крытычных рэдактарска-выдавецкіх кадраў, барацьбітоў на ідэалёгічным фронце за пралетарскую культуру і навуку.

Пры Беларускім Дзяржаўным Універсытэце існуе літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьне, якое выпускае настаўнікаў-мовазнаўцаў і літаратуразнаўцаў для сямігодак, тэхнікумаў, рабфакаў, але не існавала ніякага аддзяленьня ці прынамсі, сэкцыі, якая-б рыхтавала літаратурных працаўнікоў для рэдакцый, выдавецтваў, а таксама ня было сэкцыі, дзе-б маглі навысіць сваю літаратурную кваліфікацыю пісьменьнікі, пачынаючыя прапавацъ у галіне літаратуры, крытыкі і мастацтва.

Людзі хацелі вучыцца ў пажаданай для сёньня галіне—быць барацьбітамі за пралетарскую літаратуру, але іх часта сілком рабілі педагогамі, што адмоўна адбівалася на падрыхтоўцы кадраў для літаратуры і журналістыкі. БелАПП павінен вылучыць з сваіх радоў паэтаў і пісьменьнікаў на вучобу ў БДУ на літаратурна-творчую сэкцыю, каб там яны атрымалі вышэйшую падрыхтоўку і сталі сапраўднымі будаўнікамі пралетарскай літаратуры, крытыкі і культуры.

А дзеля гэтага кіруючыя органы і партыйная арганізацыя БДУ павінны найсьці насустрач патрэбнаму пачынаньню БелАПП'у і дапамагчы яму ў гэтай вялікай і адказнай рабоце—падрыхтоўцы літаратурна-крытычных кадраў барацьбітоў на ідэалёгічным фронце.

А.САЛАГУБ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на часопіс

ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК

Падпісная цана ў м-ц 20 кап.

Па Савецкай Беларусі

Да дзесяцігодзьдзя АБВШ. Курсанты за чыткай газэт у часе адпачынку.

НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ ДЫРЭКТАРОЎ ЦАГЕЛЕНЬ

Ажыцьцяўленьне пяцігаловага пляну сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе значнага павялічэньня вырабу цэглы.

У 1931 г. цагельні БССР выпусьцяць каля 450 млн. штук цэглы. У 1932 г. яны павінны будуць выпусьціць каля 1 з пал. мільярда штук цэглы (у 4 разы больш). Таму перад цагельнай прамысловасьцю стаіць неадкладная баявая задача рэканструяваць сваю вытворчасьць.

У БССР — каля 150 цагелень, якія ў большасьці тэхнічна адсталыя. Работа ў іх пераважна ідзе саматужным спосабам.

Слабая мэханізацыя цагелень, паўнейшая бісплянаваасьць у іх рабоце сарвалі выкананьне прамфінпляну ў 1930 г. Цагельні Самцрамсаюзу выканалі свой прамфінплян на 59 проц., цагельні мясцовай прамысловасьці — на 80 проц. і Белдзяржбудаб'яднаньня — на 90 проц.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня былі разгорнуты. Прамфінплян ня быў даведзен да кожнага рабочага. Сарвалася і забесьпячэньне рабочай сілай.

Цагельні ў сярэднім загружаны на 30 проц. Між тым, некаторыя арганізацыі будуць новыя цагельні без усякай падставы і патрэбы.

Кіраўнік Белдзяржбудаб'яднаньня тав. Васэрман у сваім выступленьні на нарадзе падаў такія факты.

У Пятрыкове пабудавана цагельня з выпускам 6 млн. штук цэглы ў год. Для сябе Пятрыкову цэгла непатрэбна, везьці-ж яе няма куды, хіба па Прыпяці... у Кіеў!

У Віцебску і Менску вырабляецца цэглы больш, чым патрэбна. А ў Воршы, дзе шпарка разьвіваецца прамысловасьць, цэглы не хапае. На Асінбудзе няма цагельні і цэглу прыходзіцца везьці з іншых месц.

Або так: будуюць новую цагельню, а дарогі да яе не праводзяць. Транспарту не набываюць, дзе возьмуць рабочую сілу і апал — ня ведаюць. У выніку дэфіцытны матар'ял — цэгла — па 15 дзён ляжыць на цагельні, а пры перавозцы хутка разьбіваецца.

У пацьвярджаньне слоў т. Васэрмана рад удзельнікаў нарады падаюць такія-ж факты простага шкодніцтва.

Магілёўская цагельня № 3 будуецца з мінулага году. Цэпер для яе шукаюць... гліны. Дарога не праведзена. Сушыльні такія, што цэгла ня высушваецца, а пакрываецца цьвіллю.

Якаесь цэглы зуісм дрэнная. Толькі 20 проц. усяго вырабу — стандарт. Сартаваньня цэглы няма.

Была і правая практыка ў рабоце цагелень, так, для мазырскай цагельні быў складзен апартуністычны плян, які прадугледжваў вырабіць 800 тыс. штук цэглы, а завод можа выпусьціць каля 4 млн. штук.

Зусім дрэнна ідзе падрыхтоўка да новага будаўнічага сэзону.

ВСНГБ яшчэ не зацьвердзіў кантрольных лічбаў цагельнай прамысловасьці. Абсталяваньнем для мэханізацыі вытворчасьці цагельні не забясьпечаны. Будаўнічыя матар'ялы не разьмеркаваны паміж цагельнямі. Вытворчыя плыны не абмеркаваны на рабочых сходах. Не забясьпечана і тэхнічае кіраўніцтва. Пляну капітальных укладаньняў няма.

Забесьпячэньне рабочай сілай — у пагражаючым стане. Інспэкцыя кадраў Наркамрацы яшчэ не прымацавала да цагелень паўных раёнаў, з якіх трэба будзе вербаваць рабочую сілу.

Інспэктар Наркамрацы тав. Радзівонаў раней, чым інфармаваць нараду аб забесьпячэньні рабочай сілай, папярэдзіў, каб лепш не выступалі на яго дакладу, бо ён сам цагельнік, ведае гэту справу і зможа ўсіх «пакрыць».

Далей тав. Радзівонаў паведаміў, што забесьпячэньне цагелень рабочай сілай сарвалася ў мінулым годзе таму, што ён, Радзівонаў, быў на курорце...

Ён спыніўся і на тым, што будзе рабіць інспэкцыя кадраў Наркамрацы ў гэтым годзе па забесьпячэньні рабочай сілай.

Аказваецца, па-першае, яна прымацуе раёны, потым будзе плянаваць і кантраляваць...

Такім чынам, цагельні будуць забясьпечаны рабочай сілай... на паперы.

Але тав. Радзівонава гэта ня турбуе, ён баіцца, каб яго «ня крылі», і калі ўдзельнікі нарады ў спрэчках прыходзілі да вываду, што «на Наркамрацы спаляваяся, а сам не заяваі», тав. Радзівонаў перайшоў да простых пагроз.

Нарада таксама заслухала даклад інжынэра-кераміка тав. Гальперына аб вырабе эфэктыўнай цэглы ў БССР.

Выраб гэтай цэглы не прадстаўляе асаблівай трудасьці. Сушыцца яна лепш, чым звычайная, апальваецца хутчэй, браку амаль няма.

Уласьцівасьць гэтай цэглы (малая гука і цёплаправоднасьць і вага) дае магчымасьць будаваць сьцены будынкаў тонкія: замест 2½ цаглін можна класьці 1½.

У БССР—шмат лесапільных заводаў. У глебе — многа торфу. З такой багатай базай дадаткаў да гліны выраб эфэктыўнай цэглы ў Беларусі мае багатыя пэрспэктывы.

У 1931 годзе выраб эфэктыўнай цэглы будзе складаць 45 проц. усяго вырабу цэглы.

Нарада пастанавіла выканаць і перавыканаць гэты процант вырабу эфэктыўнай цэглы. Для падрыхтоўкі майстроў эфэктыўнай цэглы будуць арганізаваны спэцыяльныя курсы.

У маі месяцы будзе праверана работа цагелень па вырабе новай цэглы. За лепшую якасьць і процант выкананьня цагельні будуць прэміяваны.

ЦЫВЕС.

Камунальнікі—у дапамогу веснавой сяўбе

Пашыраная нарада пры саюзе КАМУНАЛЬНІКАЎ пастанавіла на працягу лютага, сакавіка і красавіка арганізаваць пасылку РАБОЧЫХ БРЫГАД у раёны для дапамогі мясцовым арганізацыям у правядзеньні веснавой ласеўнай кампаніі. Кандыдатуры брыгадзіраў будуць абмяркоўвацца на сходах рабочых.

10 ЛЮТАГА Г. Г. ВЫЯЖДЖАЕ Ў РАЁН ПЕРШАЯ РАБОЧАЯ БРЫГАДА КАМУНАЛЬНІКАЎ У СКЛАДЗЕ 7 ЧАЛ.

У палоне нядбайнасьці

Спэцыяльная брыгада банькоў абсьледавала 13-ты польскі дзіцячы сад (Менск). Брыгада выявіла **злоўжываньні і нядбайнасьць у рабоце з боку работнікаў саду.**

З-за нядбайнасьці здарылася некалькі **няшчасных выпадкаў.** Два хлапчукі разьбілі сабе галовы, адзін з іх памёр ад запаленьня мазгоў. **Для харчоў ужываюцца папсаваныя прадукты. Кухоннае начыньне іржавае. Прыбіральня — у антысанітарным стане.** 7 чалавек абслугоўваючага пэрсаналу ўтрымліваюцца на дзіцячых пайках. **Інспэкцыя нарасьветы мала цікавіцца** становішчам дзіцячага саду.

Трэба неадкладна паляпшыць становішча дзіцячага саду.

Давыбары акадэмікаў БАН

АКАДЭМІЯ ПАВІННА РАШУЧА АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Ператварыць БАН у сапраўдны цэнтр марксыцка-ленінскай думкі!

Заслухаўшы інфармацыю тав. Шчарбакова аб выбарах новых акадэмікаў, агульны сход менскай філіі БелАПП'у разам з таварыствам літаратуразнаўцаў-марксыстаў горача вітае абнаўленьне Акадэміі новымі работнікамі, якія павінны ўсе свае сілы аддаць для будаўніцтва культуры на Беларусі, пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Акадэмія навук павінна падпарадкаваць усю сваю работу задачам сацыялістычнага будаўніцтва, накіраваць увагу сваіх працаўнікоў на тэарытычную і практычную дапамогу партыі ў будаўніцтве сацыялістычнай грамады. У прыватнасьці работнікі літаратурных установаў БАН павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу вакол актуальных праблем сучаснага марксыцкага літаратуразнаўства, выкрыцьця варожых марксызму-ленінізму тэорый у літаратурнай навуцы, стварэньня марксыцкай гісторыі беларускай літаратуры.

Работнікам літаратурных установаў БАН неабходна шчыльна зьвязацца з сучасным пралетарскім рухам, неабходна дапамагаць пралетарокай і калгаснасялянскай беларускай літаратуры ў яе штодзённым практычным жыцьці.

Сход падкрэсьлівае, што **Акадэмія тады справіцца са сваімі задачамі, калі яна будзе рашуча праводзіць у жыцьцё генэральную лінію камуністычнай партыі,** калі яна будзе працаваць пад кіраўніцтвам партыі.

Сход пастанаўляе раіць у акадэміку БАН т. т. Шчарбакова, Кроля, Панкевіча, Платуна, Будзінскага, Бурсьціна, Кедрава-Зіхмана, Сянкевіча, Нікольскага, Громэра і Рыўліна.

***

Сэкцыя навуковых работнікаў БССР, абгаварыўшы пытаньне аб становішчы і далейшым напрамку работы Беларускай Акадэміі Навук і давыбарах новых акадэмікаў пастанаўляе: раіць у правадзейныя члены Акадэміі навук наступных таварышоў: **Лубяко, Панкевіча, Платуна, Шчарбакова, Кедрава-Зіхмана, Бурсьціна, Кроля і Громэра.**

Да дзесяцігодзьдзя АБВШ. Курсанты на вучобе.

Рэдакцыйна-мэтадалёгічная калегія БАН

Для паляпшэньня справы выдавецтва Беларускай Акадэміі Навук прэзыдыум БАН ухваліў вылучыць рэдакцыйна-мэтадалёгічную калегію ў складзе 18 асоб.

У функцыі гэтай калегіі ўваходзіць дасканалае палітычнае і мэтадалёгічнае рэдагаваньне работ супрацоўнікаў БАН, якія (работы) паступаюць у друк.

Беларуская старонка ў „Лесном рабочем"

Прэзыдыум Беларускага рэспубліканскага камітэту саюзу лесдрэўрабочых ухваліў выдаваць сваю старонку ў газэце «Лесной рабочий» і абвясьціць месячнік па распаўсюджаньні гэтай газэты, давёўшы на БССР да тираж да 15.000 экз.

Прэзыдыум рэспубліканскага камітэту выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва па распаўсюджаньні газэты «Лесной рабочий» краёвыя камітэты саюзу лесдрэўрабочых заходняй і усходняй Сібіры.

Нарада па рабочым шэфстве

Учора ўвечары ў клюбе харчавікоў адкрылася шырокая нарада па рабочым шэфстве над дзяржапаратам, скліканая прэзыдыумам гарКК.

У нарадзе прымаюць удзел шэфскія брыгады фабрык і заводаў, разам з сакратарамі парткалектываў і ячэек, старшынямі фабзаўмасцкомаў, прадстаўнікамі «трыкутнікаў» падшэфных устаноў, рабкорамі, «лёгкімі кавалерыстамі», прадстаўнікамі усіх саюзаў і ЦСПСВ.

Да дзесяцігодзьдзя АБВШ. Курсавы камандзір АБВШ т. Федаровіч, прадстаўлены да ўзнагароды.

На 2-м Усебеларускім Зьезьдзе Асоавіяхіму

Дзеньнік зьезду

Учора на ранішнім пасяджэньні былі заслуханы справаздачныя даклады тав. ДРЫЛЁНКА аб рабоце цэнтральнага савету Асоавіяхіму БССР і тав. ЛОСЕВА аб рабоце рэвізійнай камісіі.

На вячэрнім пасяджэньні заслуханы даклады вайсковага сэктару і сэктару паветрана-хэмічнай абароны цэнтральнага савету.

Пасьля ўсіх дакладаў разгарнуліся спрэчкі.

Сёньня зьезд заслухае даклад сэктару авіяцыйнай справы.

Курсанты—без інтэрнату

Нічога не зрабіў Калгасцэнтр для забесьпячэньня курсантаў цэнтральнай калгаснай школы інтэрнатам. Доўгі час валяліся яны ў канцылярыі Калгасцэнтру і ў БДУ. Заняткі ў школе яшчэ не пачаліся ў той час, як курсанты прыехалі яшчэ 5 студзеня. Адпаведныя органы павінны ўмяшацца ў гэту справу.

5 ПОДПІСАЎ.

НА САВЕЦКАЕ ДЫРЫЖАБЛЯБУДАЎНІЦТВА

Курсанты 6-цімесячных курсаў «Прафруху» наладзілі суботнік на чыгунцы па расчыстцы сьнегу і запрацаваныя грошы ў суме 94 руб. унесьлі ў фонд пабудовы дырыжабля «Клім Варашылаў».

Курсанты выклікаюць рэспубліканскую школу «Прафруху», а таксама ўсе 6-цімесячныя курсы «Прафруху» Гомелю Магілеву, Віцебску і інш.

— Электраманцёр віцебскай канторы БЭО тав. Воўкаў уносіць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 25 руб. і выклікае пасьледваць яго прыкладу ўсіх рабочых і служачых як віцебскай канторы, так і ўсіх рабочых і служачых, занятых на электра - прамысловасьці СССР.

— Агульны сход рабочых саўгасу «Весялова», супольна з сялянамі-адзінаасобнікамі уносяць у фонд дырыжаблябудаўніцтва 84 руб. і выклікае рабочых саўгасу «Папелюм» і «Стара-Барысава».

— У адказ на вылазку контр-рэвалюцыянэраў—беларускіх нацдэмаў **вучні ФЗС таварнай чыгункі ў Менску ўносяць у фонд абароны краіны 250 рублёў.**

— Курсанты курсаў партактыву пры ЦК КП(б)Б (Прылукі) уносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў»—90 руб.

— Жанчыны - калгасьніцы Лагойскага раёну уносяць у фонд дырыжаблябудаўніцтва 22 руб. 60 кап.

— Агульны сход членаў саюзу Мэдсанпрацы, Горацкага раёну, у адказ на выкрыцьцё контр - рэвалюцыйнай беларускай нацыянал - дэмакратычнай групы **адлічае 2 проц.** месячнага заработку на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў і выклікае мясцкомы працасьвяты і саўгандапьслужачых гэтага-ж раёну.

— Супрацоўнік ДПУ тав. Куляшоў уносіць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» **10 р.** і выклікае наступных: т. т.: Ляхэма, Прахарэнка, Розкіна, Фішкіна, Вайсбанда, Фільмановіча, Сафарава, Гардзеева, Лабзіна і Кейлінга.

— Асьветнікі Юркаўскага і Шэвбскага аб'яднаных пэдсаветаў уносяць на пабудову дырыжабля імя АДПУ 35 руб. і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсіх асьветнікаў Лагойскага раёну.

— Усе барысаўскія фабрыкі і заводы 7-ю гадавіну сьмерці Леніна адзначылі суботнікамі, заработак ад. якіх нашоў у фонд пабудовы дырыжабля імя «Праўды». Так, «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога» адпрацавалі па 6 гадзін, гута імя Домбаля, завод «Наміптэрн», «Рабочы», «Камбінат», фабрыка «Прафінтэрн» адпрацавалі па цэламу дню. Памянёныя фабрыкі і заводы выклікаюць усе заводы папяровых прадпрыемстваў Беларусі адпрацаваць адзін дзень на пабудову дырыжабля імя «Праўды».

— Чэрвеньская П. база ЦІП'у «Установа», цясьлярска-сталярны цэх падпісваецца на пабудову дырыжабля імя «Праўды» на 46 руб., былыя курсанты і тэхпрацаўнікі ЦІП'у — на 93 руб. 50 к., разам на 130 руб. 50 кап.

Калектыў базы выклікае грэскую, вузьлянскую, капыльскую, шацкую, дудзіцкую і вузьдзенскую п/базу.

— Спухачы кармянскай праф'ячэйкі ЛКСМБ уносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 70 руб. і выклікаюць кармянскую праф'ячэйку.

Рабочы тэатр ЦСПСБ вярнуўся ў Менск

Заўчора рабочы тэатр ЦСПСБ вярнуўся з двухмесячнага падарожжа па БССР. Тэатр пабываў у Воршы, Віцебску і Полацку. Працаўнікі рабочага тэатру наладжвалі канфэрэнцыі гледачоў, выяжджалі на паасобныя прадпрыемствы і ў калгасы для дапамогі драматычным гуртком. Тэатр абслужыў каля 20 тыс. рабочых, дана 40 пастановак, ня лічачы выездаў на прадпрыемствы і ў калгасы з пастаноўкамі малых форм.

Сярод пастановак—«Вецер з мора» Чыркова і «Стрэль» Блаўменскага. Зараз у тэатры ідзе падрыхтоўка п'есы «Чыгінбуд» (на тэму будаўніцтва буйной электрастанцыі ў адным з пунктаў СССР).

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ:

— Гарком КП(б)Б склікае ў 11 гадз. раніцы, у залі пасяджэньняў гаркому, нараду сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б: зав. «Полымя рэвалюцыі», «Энэргія», «Бальшавік», «Ударнік», абутк. ф-кі, шчотачн. ф-кі, шчацін. ф-кі, зав. «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», «Пралетары», «Беларусь», ф-ка «Камунарка», «Кастрычнік», «Беларуска», футравая ф-ка, фанэрн. ф-ка, «Чырв. Тэкстыльшч.», хлебазавод, «Эльвод», ф-ка «8-га сакавіка», п/к. рэдакцый газэт, друкарні імя Сталіна, ф-ка рымароў, аўтакіраўніцтва, «Чырв. зорка», хладабойня, гута, ЦПП. У парадку дня: аб становішчы перабудовы партработы на прадпрыемствах. Даклады з месц будуць рабіць сакратары парткалектываў: «Бальшавік», «Энэргія», «Кастрычнік», «Камунар» і абутк. ф-ка. На нараду памянёныя сакратары парткалектываў і ячэек павінны зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

— Культпроп гаркому КП(б)Б у 16 гадзін склікаецца нарада т. т. вызначаных ячэйкамі: саўбуд, пэдфак, Белпэдтэхнікум, Буд. інстытут, Архітэктура - будаўнічы тэхнікум і Мэдінстытут для выкладаньня ў ВСПН. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

— Дом Камасьветы. У 19 гадз. — даклад т. Злобіна (нач. штабу кав. корпусу) для партыйнага і камсам. актыву на тэму: «Сучасная вайсковая тэхніка». Пасьля — мастацкая частка. Білеты па ячэйках і ў чытальні Дому.

— БАН. У 19 гадз., пак. № 8, — працяг спрэчак па дакладу т. Яналя аб прадукцыі катэдры сав. будаўніцтва і права. Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

— Дом Працасьветы. У 20 і 22 гадз. —кіно «Сьвята сьвятога Ергена». Білеты ў Доме Асьветы.

— Культпроп Менгаркому КП(б)Б паведамляе, што 14 лютага, у 19 гадз., у клюбе Кам. Асьветы адбудзецца вечар, прысьвечаны выпуску слухачоў першапачатковай партыйнай школы першага скліканьня. Заг. партшкол і прапагандыстам, якія кіруюць групамі на ўсіх прадпрыемствах, патрэбна зьявіцца ў Культпроп гаркому і атрымаць білеты для сваіх слухачоў.

— Парттройка Менскай гар. КК выклікае на 14 лютага, у 6 з пал. гадз. веч. наступных т. т.: Эстрына І. Л. — яч. ДПУ, Шчуцкага — яч. ВДУ, Мурашка — яч. ЦК КП(б)Б, Самусевіча — рабфак, Казлова А. Р. — гута, Шымаанскага — малы рамонт, Сініўскага — экспл., Рудэрмана, Назарчука — гарб. «Бальшавік», Калюкова — БДУ, Бераловіча, Клімава, Пліска — камвуз, Дукашонка — ДПУ, Перавозчыкава — Белдзяржбуд, Вялікова—міліцыя, Казлова — НКЮ, Багдановіча — каал. «Зямляроб», Мароза — парсуазні, Левіна — «Полымя рэвалюцыі», Арлоўскага — зав. «Камунар», Гельмадовіча — абутк. майст., Ратковіча, Мацукевіча — МБВ ч. Памянёныя т. т.: запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе іх спраў. Таксама павінны зьявіцца сакратары тых ячэек, дзе гэтыя т. т. лічацца на вучоце.

Менская Гар. КК КП(б)Б просіць т. Драздова Язэпа Сямёнавіча (п. б. № 0818932), працаваўшага ў крамкам. ЦРК, не выяжджаючы з месца работы, паведаміць свой адрас. Такая-ж просьба адносіцца да ўсіх т. т., якія ведаюць месца работы або жыцьця т. Драздова.

— Культпроп Менгаркому КП(б)Б паведамляе, што новы набор слухачоў у гарадзкую першапачатковую партшкоду, працягваецца да 13 лютага. Парткалектывы і ячэйкі КП(б)Б, якія спазьніліся выслаць сваіх людзей на ўплыў культпропу гаркому аб камплектаваньні школы, павінны выслаць людзей да 6 гадз. веч. на працягу 10, 11, 12 і 13 лютага на Інтэрнацыянальную вул. у памяшканьні першай сямігодкі (2-гі паверх) са сьпісамі да загадчыка школы тав. Бухцілава.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 23.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-71	Галоўная контора	3-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Адказны падпісей	7-31
		Сэкцыя абвестак	7-31

Умовы падпіскі (з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	1 р
„ 3 мес.	— „ 3 „
„ 6 мес.	— „ 6 „
„ 12 мес.	— „ 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на месцах.

Цана за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту — 50 к., перад гарадзкім абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоўнасьць тэксту—у два разы дарожэй. Контрольны экземпляр выдавецтва № 52|10360 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 23, 2-гі паверх тэл. 7-31.

Чацьвер. 12 лютага. Паказ для саюзу харчавікоў. Пачатак а 8 гадз.

Беларускі другі дзяржаўны тэатр В. Кіршон.

РЭЙКІ ГУДУЦЬ

П'еса ў 5 дзеях, 9 абразох.

СЁНЬНЯ, 12 лютага адбудзецца 4 ЛЕКЦЫЯ

курсаў нізавога мопраўскага актыву ў памяшканьні ЦК МОПР'у БССР роўна ў 7 гадз. веч.

Усе курсанты павінны зьявіцца без спазьненьня. Запрашаецца мопраўскі актыў.

ІУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Вялікі гукавы фільм оправа 13 ДЗЁН «ПРАМІНАРТЫ»

Звыш праграмы ХРОНІКА СЯЮЗКІНО № 1 за 1931 г.

Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура"

Новы фільм вытворчасьці Саюзкіно (Трастбендзяржкіно) Сапраўднае жыцьцё

Пач. сэансаў: у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 гад. 20 мін. Каса—5 гадзін

КІНО „Інтэрнацыянал"

Мастацкі фільм немец. вытворчасьці ГОРНАЯ БАЛЯДА

Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г.30хв.

КІНО „Пралетары"

Мастацкі фільм паводле раману ШОЛОМ-АЛЭЙХЭМА МАБУЛ (Крывавы пятно) драма ў 9 частках.

Пач. 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр"

Эпізод з грамадзянскай вайны паводле аповесьці Д. Фурманава МЯЦЕЖ ў 6 частках.

Пач. сэансаў з 1 г. дня. Каса з 12 г.

КІНО „СПАРТАК"

ІГАР ІЛЬІНСКІ ў фільме Закройшчык з Таржка камедыя ў 6 частках.

Пач. 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 30 м. 11 г. Каса—з 5 г.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

Гал. кантора газ. „Зьвязда" просіць іншагародніх падпісчыкаў ЗДАВАЦЬ ПАДПІСКУ на газэту „ЗЬВЯЗДА" сваім бліжэйшым ПАШТОВЫМ ГАЗЭТНЫМ БЮРО, а не пасылаць грашовых пераводаў у адрас канторы.

15-га ЛЮТАГА КАНЧАЕЦЦА КАМПАНІЯ ЗІМОВАЙ ДАПАМОГ.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР паведамляе — што — кампанія зімовай дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям канчаецца 15-га лютага 1931 году

ЦК МОПР'у БССР прапануе ўсім ячэйкам зараз-жа перадаць сабраныя сродкі на пошту для пераводу ў ЦК.

Гаркомам і райкомам МОПР'у праверыць, якія ячэйкі яшчэ не ўключыліся ў кампанію зімовай дапамогі, прыняць меры да разгорвання гэтай кампаніі ва ўсіх ячэйках.

Тыя ячэйкі, ад якіх да 1-га сакавіка г.г. не паступяць сабраныя сродкі на КЗД, будуць лічыцца, як непрымаўшыя ўдзелу ў КЗД.

Адначасова ЦК МОПР'у зварачаецца да ўсіх ячэйкаў разгортваньні работы па ліквідацыі запазычанасьці па членскіх узносах за 1930 г. і спагнаньні членскіх узносаў за 1-ы квартал 1931 г.

ЦК МОПР'у БССР.

Бабруйскі дзяржаўны дашкольны ПЭДТЭХНІКУМ

ПРАВОДЗІЦЬ НАБОР СТУДЭНТАЎ на першы курс.

Прымаюцца скончыўшыя сямігодкі, або маючыя веды, адпавядаючыя курсу сямігодкі.

У пэдтэхнікум прымаюцца дзеці рабочых, калгасьнікаў, беднякоў, сераднякоў і служачых.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 20 ЛЮТАГА.

Дырэктар тэхнікуму ШУЛЯКОЎСКІ.

МЦРК паведамляе, што з 12-II—31 г. па літарах альфабэту пачынаецца выдача новых наборных КНІЖАК па вядомленьнях міліцыі грамадзянам, якія жывуць у прыватных і калгасных домах у наступныя дні:

12-II—31 г.	праходзяць літары	А—Б
13-II—31 г.	„ „	В—Г
14-II—31 г.	„ „	Д—Ж—Е
15-II—31 г.	„ „	З—І—К
16-II—31 г.	„ „	Л—М
17-II—31 г.	„ „	Н—О—П
18-II—31 г.	„ „	Р—С
19-II—31 г.	„ „	Т—У—Ф
20-II—31 г.	„ „	К—Ч—Ш
21-II—31 г.	„ „	Ю—Я
22-II—31 г.	„ „	Э—У

Увага. Грамадзяне, якія жывуць у домах жэкаў, будуць атрымліваць новыя наборныя кніжкі па сваіх жэкатах згодна распарадку праўленьня жэку.

Праўленьне МЦРК.

Камісія, выпучаная гаркомам КП(б)Б 8-га лютага 1931 г. прыступае да дэтальнага агляду працы газэтнага бюро і дэтальнага высьвятленьня недахопаў па распаўсюджаньні газэт, часопісяй сярод падпісчыкаў. Усім упаўнаважаным прадпрыемстваў і устаноў па выпісцы газэт, а таксама падпісчыкам аб усіх недахопах з выпіскай газэт даваць матар'ялы камісіі.

Пэдфаку БДУ патрэбен ІНЖЫНЭР для кіраўніцтва вытворчай практыкай студэнтаў.

ПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Заявы падаваць у канцылярыю пэдфаку.

Універсытэцкі гарадок, прыродазнаўчы корпус.

Згубленую пячатку Нараўлянскага райпрафкому саюзу СГЛР лічыць несапраўднай.

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка Грэскага загатоўчага пункту „Саюзкур". Лічыць несапраўднай.

Калектыў супрацоўнікаў Наркамгандалю БССР з жалем паведамляе аб сьмерці члена калектыву Т. ГОРЫНАЙ, Ганны Фэбусаўны і выражае сваё глыбокае спачуваньне сям'і і сваякам

Калектыў служачых.

ДЭКАНАТ НАРГАСУ прапануе ўсім студэнтам—практыкантам Наргасу прамысловага адз. усіх курсаў, якія ад'яжджаюць вытворчую практыку ў г. Менску і кіраўнікам практыкі зьявіцца на нараду, якая адбудзецца 15-II г. г. у 6 гадз. вечара ў 105 аўд. (Галоўны корпус)

Факультэт Народнай гаспадаркі БДУ прапануе ўсім экстэрнам, якія лічацца на ф-тах Наргасу ў двухдзённы тэрмін зьявіцца на перарэгістрацыю ў дэканат.

Інспэкцыі камунальнай гаспадаркі Бабруйскага гарадзкога савету — ПАТРЭБЕН — ТЭХНІК-БУДАЎНІК АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Жадаючыя павінны падаць заяву з прыладжаньнем дакумэнтаў.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1931 год на штотэднёвую навукова-тэхніка-эканамічную ЧАСОПІСЬ „ГИПРОМЕЗ"

орган Дзяржаўнага Інстытуту па праектаваньні металюргічных заводаў.

У праграме часопісі: асьвятленьне результатаў навукова-даследчых работ Інстытуту. АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ПРАЕКТАВАЎНЯ. Новыя вытворчыя працэсы, навуковыя нашай прамысловасьці. Стандарты, коды, тэхнічныя нормаваньні. СПРАВАЧАДАЧЫ АБ ЗАМЕЖНЫХ КАМАНДЫРОЎКАХ. Результаты замежных кансультацый. СІСТЭМАТЫЧНЫЯ АГЛЯДЫ ЗАМЕЖНАЙ ТЭХНІЧ АЙ ЛІТАРАТУРЫ, пад рэдакцыяй праф. М. А. ПАУЛАВА.

Падпісная плата.	для Устаноў і прадпрыемстваў	для Інжынэраў і тэхнікаў.	для студэнтаў.
на 12 мес.	18 р. — к.	12 р. — к.	6 р. — к.
на